П. К. ПАНАМАРЭНКА

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»

П. К. ПАНАМАРЭНКА

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

★

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943



П. К. Панамарэнка

## ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

З самага пачатку вайны совецкія патрыёты ў часова захопленых ворагам раёнах пачалі ствараць па закліку таварыша Сталіна партызанскія атрады, конныя і пешыя, дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожых армій, для ўзрыву дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, знішчэння складаў, баз. Партызанскія атрады ў ходзе айчыннай вайны станавіліся гразой для ворага і ўсіх яго пасобнікаў, праследуючы і знішчаючы іх на кожным кроку, зрываючы ўсе іх мерапрыемствы.

Да двухгоддзя Вялікай айчыннай вайны партызанскі рух вырас у грозную сілу і ператварыўся ў адну з важнейшых умоў немінучага разгрому ворага. Так ацэньвае партызанскую барацьбу таварыш Сталін ва ўсіх сваіх выступленнях і загадах за час айчыннай вайны. У кожным загадзе ён нязменна звяртаецца і да партызан і да партызанак, падкрэсліваючы гэтым тую велізарную ролю,

якую заклікаты адыгрываць народныя мсціўцы ў знішчэнні ненавісных захопнікаў.

Гітлераўцы крывавым тэрорам, сістэмай правакацый і агіднай, хлуслівай прапагандай у часова акупіраваных абласцях СССР хацелі запалохаць, збіць з толку «уціхамірыць» жыхароў, дамагчыся ад іх рабскага падпарадкавання нямецкім камендантам і падкамендантам, пакорлівага абслугоўвання патрэб гітлераўскай арміі, прамысловасці, бессупярэчлівай здачы прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Па ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі ідзе зверская расправа з насельніцтвам: масавыя забойствы, расстрэлы, павешанні, удушэнні, атручванне. Нямецкія ліхадзеі планамерна знішчаюць савецкіх людзей: дарослых мужчын, якіх лічаць сваімі непрымірымымі ворагамі, якія ў любы момант могуць стаць партызанамі; падлеткаў і дзяцей як будучых салдатаў савецкай дзяржавы; жанчын як матак, нараджаючых і выхоўваючых воінаў— апору роднай краіны.

У той-жа час нямецкая прапаганда ўсякім чынам намагаецца ашукаць савецкіх людзей. Правакацыйныя кніжкі, лістоўкі, газеты, радыёперадачы, малюнкі, плакаты на платах і дамах, афіцыйныя распараджэнні нямецкіх улад—усё разлічана на тое, каб збіць з толку, адурачыць савецкіх людзей.

Смярдзючым подыхам сваёй прапаганды захопнікі хочуць зламаць веру ў народа ў пе-

рамогу Чырвонай Арміі і аднаўленне савецкай улады і тым самым выклікаць безнадзейнасць, зламаць супраціўленне мас, а значыць, падрэзаць карэнні народнага партызанскага руху. На якія толькі правакацыйныя хітрыкі не ішла варожая прапаганда, імкнучыся даказаць, што з Чырвонай Арміяй усё пакончана, пераканаць усіх у «непераможнасці» германскай зброі! Нямецкія афіцэры па ўказанню Гебельса ў кожным вялікім горадзе наладжвалі шумныя святы з прычыны «узяцця Масквы». У многіх гарадах і раённых цэнтрах, захопленых ворагам, былі адкрыты бюро прапускоў, якія выдавалі прапускі на права праезду па чыгунцы ў Свердлоўск, Ленінград, Горкі, быццам-бы занятыя нямецкімі войскамі.

Увесь гітлераўскі друк запоўнены злоснай хлуснёй на Савецкі Саюз і ілжывымі байкамі аб «райскім жыцці» у Германіі.

Аграбіўшы савецкае сялянства ў акупіраваных раёнах, адабраўшы прылады і сродкі вытворчасці, жывёлу, зямлю, прымусіўшы заняволеных людзей у многіх месцах насіць біркі і нумары, насаджаючы ўсюды зверскае самавольства нямецкіх памешчыкаў і баронаў, завалодаўшых савецкімі землямі, гітлераўцы ў той-жа час узнімаюць правакацыйны шум навокал нейкай зямельнай рэформы, абяцаюць селяніну «сваю гаспадарку на сваёй зямлі». Мэта зразумела: ашукаць лёгкаверных і адцягнуць іх увагу ад барацьбы.

Такі-ж правакацыйны шум немцы ўзнялі навокал пытання рэлігіі. Верацярпімасць савецкай дзяржавы, ахаваная Канстытуцыяй, свабода веравызнання ў Савецкім Саюзе скажаюцца захопнікамі на ўсякія лады. Прыкідаючыся хрысталюбцамі, стараннымі абаронцамі веры, гітлераўцы спрабуюць скарыстаць рэлігійныя пачуцці веруючых для сваёй выгады.

У той-жа час сакрэтныя інструкцыі, як напрыклад інструкцыя начальніка ваенна-эканамічнай інспекцыі Цэнтральнага фронта генерал-лейтэнанта Вейгана «аб актуальных задачах ва ўсходніх абласцях», змяшчаюць праграму ўдушэння і знішчэння царквы ў СССР. Інструкцыя патрабуе безадкладна ўзяць пад кантроль гестапа пропаведзі свяшчэннікаў, як і наогул усю іх дзейнасць. Яна прапануе ўзяць курс на закрыццё цэркваў, якія знаходзяцца ва ўсходніх абласцях. Узамен хрысціянства нямецкі ґенерал прапануе насаджаць сярод насельніцтва «новую рэлігію, адпавядаючую патрабаванням і характару германскай дзяржавы».

Праводзячы ў жыццё сваю праграму, гітлераўцы здзекуюцца з рэлігіі, апаганьваюць цэрквы, ператвараючы іх у канюшні, склады і часта спальваюць іх. З духавенства і веруючых здзекуюцца і знішчаюць іх.

* * *

Хлуслівая фашысцкая прапаганда не знайшла і не знойдзе водгуку сярод насельніцтва. Дэмагагічныя прыёмы гэтай прапаганды абвяргаюцца рэчаіснасцю. Сапраўды, ці можа мець поспех варожая дэмагогія, распальваючая прыватнаўласніцкія інстынкты, калі самі-ж нямецкія «абаронцы» прыватнай уласнасці грабяць увесь народ, раскрадаюць не толькі грамадскі набытак, але і ўсё тое, што накапілі савецкія сем'і ў выніку шматгадовай працы?!

У спецданясенні № 51 ад 6 верасня 1942 года начальнік спецслужбы прапаганды пісаў Гебельсу:

«Я хацеў пераканаць рускае насельніцтва, што нямецкая ўлада справядлівая і жадае ім дабра. Выпадак, падобны да таго, які меў месца ў вёсцы Дмітраўцы, прыводзіць да зусім процілеглых вынікаў. У Дмітраўку прыехаў агітаўтамабіль. Па радыё было абвешчана, што жыхары могуць быць спакойны, што ўсё тое, што імі было чэсна зароблена, належыць ім і ад іх нічога не адбяруць. Але не паспеў яшчэ аўтамабіль ад'ехаць у другі канец вёскі, як сельскагаспадарчыя кіраўнікі забралі ўсіх кароў. Якая думка жыхароў аб нашай уладзе—зусім зразумела».

Прапаганда вядомага фашысцкага «новага парадку» асуджана на правал і нязменна правальваецца, таму што ўсё насельніцтва бачыць, што гэта «парадак» крывавага тэрору,

шыбеніц, засценкаў гестапа, угону ў нямецкае рабства совецкіх людзей, рабаўніцтва, голаду.

Усе спробы захопнікаў запалохаць совецкіх людзей, збіць іх з толку, раз'еднаць, пазбавіць волі да барацьбы скончыліся няўдачай. Народ гнаў ад сябе атрутны туман фашысцкай дэмагогіі, які пранікаў ва ўсе шчыліны.

У самы цяжкі час першых месяцаў вайны совецкія людзі не трацілі веры ў свае сілы, веры ў правату сваёй справы. Гэтая вера ў агні барацьбы і пакутаў узмацнела яшчэ больш.

Крывавыя рэпрэсіі не паставілі народ на калені. Зверствы немцаў прывялі да яшчэ большага расшырэння і абвастрэння партызанскай барацьбы, надалі ёй характар бязлітаснай помсты за забітых, закатаваных, абняслаўленых жонак і дзяцей, матак і бацькоў, сясцёр і братоў, за спаленыя гарады і сёлы, за знішчаны набытак.

Нарастаючая нянавісць народа ператваралася ў справу. Народ усюды знаходзіў спосаб дзеяння. З нябачанай жорсткасцю і ўпартасцю разгарэлася ўзброеная партызанская барацьба, непрымірымая барацьба супроць фашысцкай ідэалогіі і мерапрыемстваў, якія праводзяцца разбойніцкай гітлераўскай дзяржавай на часова акупіраванай совецкай тэрыторыі.

З народных мас, адведаўшых радасць сва

боднага працоўнага жыцця пры совецкім ладзе, выхаваных на самых перадавых, прагрэсіўных ідэях большэвіцкай партыі, узняліся многія тысячы самаадданых барацьбітоў і таленавітых арганізатараў партызанскага руху, якія аддалі сябе адной вялікай задачы — знішчэнню ненавіснай арміі і тэхнікі нямецкіх захопнікаў усімі даступнымі народу спосабамі.

Узброеную барацьбу мас супроць акупантаў узначалілі людзі з народа, да канца адданыя партыі Леніна—Сталіна. Гэта партыйныя, совецкія, гаспадарчыя, комсамольскія, профсаюзныя, навуковыя і іншыя работнікі. Гэта доблесныя камандзіры, палітработнікі і байцы Чырвонай Арміі, якія папалі ў акружэнне, не змаглі прабіцца да сваіх і аддалі сябе партызанскай барацьбе. Гэта брыгадзіры калгасаў, старшыні і члены сельскіх советаў, шматлікая сельская інтэлігенцыя: урачы, аграномы, настаўнікі, землямеры,—калгаснікі і рабочыя, партыйныя і беспартыйныя, якія сталі арганізатарамі партызанскага руху.

Яны разгарнулі велізарную палітычную работу сярод народа. Увесь шматгадовы вопыт партыі Леніна—Сталіна, яе бясспрэчны аўтарытэт у народзе, яе бясстрашша перад небяспекай, найглыбейшая адданасць справе працоўных, яснае разуменне мэт барацьбы—усё гэта стала ў руках народных мсціўцаў велізарнай арганізуючай сілай, падымаючай масы

на Вялікую айчынную вайну супроць гітлераўскай тыраніі.

Наша палітычная прапаганда і агітацыя набыла велізарнае значэнне ў часова акупіраваных абласцях: яна няспынна выкрывае крывавыя замыслы і подлыя справы ворага, умацоўвае ў народзе веру ў аднаўленне совецкай улады. Наша прапаганда мае справу з цяжкай і суровай рэчаіснасцю, з велізарнымі цяжкасцямі ва ўмовах падполля, але яна ўмацоўвае дух супраціўлення ворагу, дух непрымірымасці і ўпэўненасці ў праваце нашай справы, у нашай надыходзячай перамозе над ворагам. Гэтая вера—жыватворчая крыніца руху. Палітычная работа ўзнімае супроць захопнікаў усё новыя і новыя масы насельніцтва. Палітычная прапаганда і агітацыя ва ўмовах акупацыі мае пэўны напрамак, яна мае баявы, наступальны, дзейны характар і з'яўляецца вастрэйшай зброяй барацьбы з ворагам.

Палкімі прапагандыстамі і агітатарамі ў часова акупіраваных раёнах сталі тысячы людзей з народа. Маткі, страціўшыя дзяцей і ўсё, што было дарагога, заклікаючыя да свяшчэннай помсты, успалымлялі сэрцы. Бачачы галодных, абарваных дзяцей, страціўшых бацькоў, дом, якія блукаюць у пошуках прытулку і кавалка хлеба, сэрца сціскалася невыказным смуткам, напаўнялася лютай нянавісцю да ворага і рукі цягнуліся да зброі. Старыя, якія шмат бачылі на сваім вяку, уз-

броеныя вялікім жыццевым вопытам, якія пражылі большую частку свайго шматпрацоўнага жыцця да рэвалюцыі, маюць магчымасць многае параўнаць і зараз трапілі ў страшэнны ўціск нямецкай акупацыі, сталі непахіснымі байцамі і добрымі прапагандыстамі і агітатарамі.

Партызаны і насельніцтва аднаго з акупіраваных раёнаў ушаноўваюць памяць расстрэлянага гітлераўцамі свяшчэнніка, якога яны спрабавалі прымусіць да праслаўлення з амвона германскай зброі. Але гэты дастойны патрыёт замест ухвалення немцаў чытаў веруючым пропаведзі аб Дмітрыі Данскім і Александры Неўскім, аб тым, як яны ад гвалтаўнікоў і занявольвальнікаў адстаялі зямлю рускую.

У Н-скім раёне Мінскай області ў дні XXV гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Социялістычнай рэволюцыі партызанамі і насельніцтвам было вывешана ў вёсках 728 лозунгаў ЦК ВКП(б) на чырвоных палотнішчах, 1380 плакатаў, партрэтаў таварыша Сталіна, лістовак, радыёзводак. У сотнях вёсак былі вывешаны чырвоныя сцягі ў тым ліку і ў раённых цэнтрах і сёлах, дзе знаходзіліся варожыя гарнізоны. У дзесятках вялікіх сёлаў адбыліся гутаркі, сходы і мітынгі мясцовых жыхароў. Людзі калектыўна слухалі па радыё даклад таварыша Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага совета.

Такія гутаркі, сходы, слуханне радыёпера-

дач, вывешванне сцягаў, лозунгаў, партрэтаў кіраўнікоў партыі і ўрада ў дні совецкіх святаў—для нас справа прывычная, гэта ўвайшло ў наш быт. Але ў фашысцкай няволі, на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі, дзе кожнаму жыхару за чытанне лістоўкі або ўдзел у сходзе пагражае расправа, гэта з'яўляецца сур'ёзным крокам па шляху далучэння совецкіх людзей да барацьбы з захопнікамі.

На акупіраванай тэрытарыі створана шырокая сетка падпольнага друку. Распаўсюджваюцца дзесяткі раённых і абласных газет якія выдаюцца друкарскім спосабам. Амаль у кожным партызанскім атрадзе выдаюцца лістоўкі для насельніцтва. Газеты і лістоўкі выкрываюць хлуслівую фашысцкую прапаганду, указваюць насельніцтву сродкі барацьбы і шляху да вызвалення ад нямецкіх акупантаў.

Газеты—гэта магутная зброя партызанскіх атрадаў, падпольных партыйных арганізацый і камітэтаў—сістэматычна друкуюць зводкі Совецкага Інформбюро, весткі з «Вялікай зямлі», даюць палітычную, ваенную, міжнародную інфармацыю.

Ужо самыя назвы гавораць аб мэтанакіраванасці газет: «За Родину», «Народный мститель», «Патриот Родины», «В бой за Родину», «За Советскую Родину», «Смерть фашизму», «Сцяг Леніна», «Сталинское племя», «Кировец», «Ленинец», «Советский патриот», «Го-

лос партизана», «Клич Родины», «За Советскую Белоруссию» і г. д.

Газеты распаўсюджваюцца сярод насельніцтва, расклейваюцца на платах і нават у вітрынах для афіцыйных аб'яў нямецкіх улад, падкідваюцца на сталы нямецкіх камендантаў. Газеты так законспіраваны і прыкрыты ўзброенай аховай, што ніякія намаганні гестапа сарваць іх выпуск не мае ніякіх вынікаў.

А ў такіх кутках акупіраванай тэрыторыі, куды вельмі цяжка даставіць газеты і лістоўкі, вясковыя настаўнікі, школьнікі, калгаснікі перапісваюць ад рукі весткі з радзімы, заклікі партыі або самі складаюць лістоўкі і распаўсюджваюць іх сярод насельніцтва.

Падпольная комсамольская арганізацыя горада Віцебска ў адну ноч на ўсе нямецкія плакаты і аб'явы, расклееныя па вуліцах, паставіла яркі штам: «Звычайная нямецкая хлусня». На другі дзень, к задавальненню віцеблян, чыноўнікі і паліцыя здзіралі са сцен і платоў уласную прадукцыю.

Якія толькі віды сувязі не маюць з насельніцтвам партызанскія атрады, падпольныя партыйныя і комсамольскія арганізацыі. Аўтарытэт іх у народзе вялікі. Лепшыя людзі з партызан і мясцовых жыхароў ідуць у рады партыі, і нягледзячы на ўсю складанасць работы ў падполлі партыйныя арганізацыі няспынна растуць за кошт самых адданых, адважных людзей, якія даказалі свой патрыя-

гызм на справе, у барацьбе з нямецкімі захопнікамі.

Народу глыбока ненавісны ўсе без выключэння мерапрыемствы акупантаў; затое з вялікай сімпатыяй і радасцю сустракае ён усё, што напамінае савецкую радзіму.

Характэрны факт: гітлераўскім уладам прышлося загадам адмяніць перайменаванне вуліц імёнамі Гітлера і германскіх ваеначальнікаў і замяніць іх нейтральнымі назвамі, таму што ніяк не ўдавалася спыніць зрыванне надпісаў або зневажальныя прыпіскі да іх.

У Мінску, у кінотэатры, у час паказу кінохронікі аб «ваенных поспехах нямецкай арміі» дэманстраваўся паветраны бой, у выніку якога, па замыслу нямецкіх хранікёраў, «месершміты» павінны былі начыста знішчыць усе савецкія самалёты. Але як толькі на экране з'явіліся савецкія чырвоназорныя ястрабкі, зал напоўніўся шумнымі апладысментамі. Далейшая дэманстрацыя хронікі была спынена.

На Палессі немцы паспрабавалі адкрыць некаторыя школы для стварэння ўражання клопатаў аб асвеце. У адной школе дзеці пры першай сустрэчы з настаўнікам адразу-ж пачалі задаваць пытанні: «Чаму ў памяшканні школы няма партрэта таварыша Сталіна?». А калі адзін з настаўнікаў, прывезены з Германіі, зрабіў нягодніцкі даклад на тэму «Хто нашы прыяцелі і хто ворагі?» і запытаўся ў вучаніцы: «Ці зразумела, хто нашы ворагі?»—дзяў-

чынка, не задумваючыся, адказала: «Цяпер нам усім зразумела, што нашы галоўныя ворагі—фашысты».

Насельніцтва прагна ловіць кожную весточку з «Вялікай зямлі». Адна скінутая і падабраная лістоўка «Вести с Советской Родины»[1] з'яўляецца зброяй велізарнай сілы супроць нямецкіх правакацый. Туды, дзе скідаюцца з савецкіх самалётаў лістоўкі, сяляне ідуць за дзесяткі кілометраў, спадзяючыся атрымаць лістоўку з Масквы і для сваёй вёскі. У нас ёсць экземпляр газеты «Правда» з дакладам таварыша Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага совета 6 лістапада 1941 года. Гэты экземпляр «Правды» прайшоў з рук у рукі праз сотні населеных пунктаў некалькіх раёнаў. Даклад таварыша Сталіна прачыталі больш 10 тысяч чалавек, яго хавалі як вялікую каштоўнасць, беражліва, у сурвэтцы, насілі з сяла ў сяло і як гістарычны дакумент даставілі на «Вялікую зямлю». Такія выпадкі не адзіны.

* * *

Партызанскі рух па сваёй прыродзе з'яўляецца глыбока патрыятычным. Ён нарадзіўся і вырас у тоўшчы народных мас. Ён выклікан гарачым імкненнем народа ў што-б там ні ста-

---

[1] «Вести с Советской Родины»—перыядычнае выданне Галоўнага Палітычнага Упраўлення РККА спецыяльна для насельніцтва часова акупіраваных раёнаў.

ла захаваць свабоду і незалежнасць роднай краіны, абараніць свой горад, вёску, адстаяць ад крывяжэрнага ворага свой дом, сям'ю, набытак.

Крыніца велізарнай сілы хаваецца ў глыбока народным характары партызанскага руху і ў тым, што актыўнасць і ініцыятыва мас узначальваюцца партыяй Леніна—Сталіна, якая ажыццяўляе цвёрдае і мудрае кіраўніцтва партызанскім рухам.

Невычарпальнай з'яўляецца разнастайнасць прыёмаў і сродкаў народнай вайны супроць усіх ваенных, палітычных і гаспадарчых мерапрыемстваў акупантаў. Партызанская вайна наносіць ворагу страты ўсімі магчымымі сіламі і сродкамі зрывам загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, лесу і выкапнёвых; утойваннем ураджаю; вывадам са строю заводаў і фабрык; знішчэннем захопнікаў, іх пасобнікаў і стаўленікаў; барацьбой супроць угону насельніцтва на фашысцкую катаргу ў Германію; знішчэннем чыноўнікаў акупацыйнага апарата, нямецкіх сельскагаспадарчых кіраўнікоў, знішчэннем варожых гарнізонаў, баз, складаў, аўтамашын, сродкаў сувязі; знішчэннем воінскіх эшалонаў, чыгуначных мастоў, станцый і інш.

Насельніцтва адмаўляецца прызнаваць органы гітлераўскіх улад і зрывае іх распараджэнні. У Данбасе была абвешчана мабілізацыя працаздольнага насельніцтва. У дзень яўкі ў нямецкія ўстановы не з'явіўся ніводзін чала-

век. У Свенцянскім павеце, Літоўская ССР, з'явіліся на мабілізацыйны пункт тры чалавекі ад усяго павета. У Мінскай області немцы не адзін раз, але дарэмна спрабавалі арганізаваць Беларускі корпус самаабароны. Дабравольцаў не знайшлося, ад прымусовай мабілізацыі насельніцтва ўхілілася. У Ленінградскай області калгаснікі, прыгнаныя на загатоўку лесу, нягледзячы на ўсе намаганні немцаў, выканалі толькі адзін процант задання.

У многіх раёнах Украіны, Беларусі, акупіраваных раёнах Ленінградскай, Калінінскай, Смаленскай, Орлоўскай абласцей знішчаны амаль усе нямецкія сельскагаспадарчыя кіраўнікі, разагнаны органы акупацыйнай улады па вёсцы. Насельніцтва не здае немцам хлеба, мяса, малака.

Сотні, тысячы партызанскіх атрадаў, якія выраслі на часова захопленай ворагам тэрыторыі загартаваліся ў баях, арганізацыйна і палітычна ўзмацнелі. Рост ваеннага вопыту партызанскіх атрадаў выклікаў шырокае прымяненне тэхнічных сродкаў барацьбы.

Шматлікія партызанскія атрады, прымяняючы сучасную зброю, дэзарганізуюць тыл гітлераўскай арміі, наносяць моцныя ўдары па камунікацыях, аказваюць вялікую дапамогу Чырвонай Арміі.

Такія аперацыі, як аперацыя ўкраінскіх партызан, разграміўшых Сарнскі чыгуначны вузел, як слаўныя справы беларускіх партызан: узрыў

вялікіх мастоў на рэках Пціч і Дрыса, разгром станцыі Слаўнае, разгром гарнізона і ваенных аб'ектаў горада Слуцка; узрывы вялікіх—Наўлінскага і Выгоніцкага—мастоў са знішчэннем іх гарнізонаў, зробленыя арлоўскімі партызанамі; разгром гарнізона і станцыі Прыгор'е і стаяўшыя на ёй эшалоны, утвораны смаленскімі партызанамі; аперацыя ленінградскіх партызан, знішчыўшых генерала фон Віртца з яго аховай; поўны разгром чатырох гарнізонаў на востраве Вялікі Крэменецкі, утвораны карэла-фінскімі партызанамі; узрыў Саўкінскага маста і разгром Сутокскага гарнізона, зробленыя калінінскімі партызанамі; разгром штаба корпуса ва Угодскім заводзе маскоўскімі партызанамі і многія іншыя аперацыі ўвойдуць бліскучымі старонкамі ў гісторыю айчыннай вайны.

За 2 гады партызанскай вайны ў тыле нямецкіх захопнікаў, па далёка не поўных даных (г. зн. па тых звестках, якія маглі быць дастаўлены з тылу), совецкія партызаны знішчылі больш 300 тысяч акупантаў, з іх 30 генералаў, 6.336 афіцэраў, 1.520 лётчыкаў; узята ў палон 2.747 варожых салдатаў і афіцэраў. За гэты-ж час арганізавана не менш 3 тысяч крушэнняў варожых эшалонаў, знішчана 3.263 чыгуначных і шасейных масты. Знішчана 1.191 танк і бронемашына, 476 самалётаў, 378 гармат, 14.645 грузавых і легкавых аўтамашын, 895 баз і складаў з узбраеннем і боепрыпасамі.

Апрача таго партызанамі захоплены трафеі: 76 танкаў, 163 гарматы, 2.320 кулямётаў, 2.631 аўтамат, 25.394 вінтоўкі, многа боепрыпасаў.

Ад караючай рукі народных мсціўцаў не ратуюць гітлераўцаў ні тонкая паліцэйска-ахоўная служба, ні быстраходныя машыны.

У горадзе Харкаве з досыць моцным шматлікім гарнізонам загінуў ад рукі ўкраінскіх партызан штаб нямецкай пяхотнай дывізіі, у тым ліку генерал Браун. Ленінградскія партызаны знішчылі групу варожых аўтамашын, пры гэтым загінулі генерал Р. фон Віртц і яго ахова. Дзве беларускія дзяўчыны пакаралі смерцю буйнага нямецкага разведчыка барона фон Файта. Ад рукі смаленскіх партызан загінуў генерал Отто фон Добшыц. Нямецкага гестапаўца Брандта партызаны забілі ў самым Віцебску, на вуліцы. У Мінску, проста ў канцылярыі, прыкончылі буйнага нямецкага агента Фабіяна Акінчыца. У Баранавічах ад рукі партызан загінуў галоўны камендант горада Фрыдрых Фенч.

У раёне Мінска ў чэрвені гэтага года партызаны знішчылі амаль усіх абласных нямецкіх камендантаў і падкамендантаў, у тым ліку нямецкага абласнога кіраўніка Людвіга Эрэнлейтнера, урадавага інспектара Генрыха Клозе, начальніка абласнога сельскагаспадарчага ўпраўлення Гюнтэра Беневіца, начальніка абласной жандармерыі Карла Калла і суправа-

джаўшых іх чыноўнікаў і афіцэраў Вальтэра Пагарэлля, Карла Зандфоса, Карла Вундэрліха, Аўгуста Штрасера, Франца Так і Фрыца Шульцэ. Знішчаюцца нямецкія раённыя і абласныя сельскагаспадарчыя кіраўнікі, чыноўнікі акупацыйных органаў, упаўнаважаныя па адпраўцы совецкіх грамадзян на германскую катаргу.

Вялікае значэнне для справы перамогі мае баявая работа партызан на камунікацыях праціўніка. Нямецкія камунікацыі праходзяць праз Польшчу, Украіну, Беларусь, Літву, Латвію, Эстонію. Па гэтых камунікацыях ідуць ворагу на фронт тэхніка, баепрыпасы, папаўненні, а ў Германію вывозіцца награбленае немцамі народнае дабро. Боездольнасць фашысцкай арміі на совецка-германскім фронце ў значнай ступені залежыць ад бесперабойнай работы гэтых камунікацый.

Партызанскія атрады і групы на ўсёй акупіраванай тэрыторыі няспынна нападаюць на камунікацыі праціўніка. Яны спускаюць пад адкос воінскія эшалоны, знішчаючы грузы і жывую сілу, узрываюць масты, вадакачкі, стрэлачныя пераводы, крыжавіны, шляхі, станцыйныя пабудовы, разбураюць лініі чыгуначнай сувязі, знішчаюць нямецкую чыгуначную прыслугу і ахову шляху і эшалонаў. На большасці чыгуначных ліній захопнікі вымушаны пускаць эшалоны толькі ўдзень, прытым з вялікай аховай і з кантрольнымі праверкамі шляху. Ахова камунікацый патрабуе ад немцаў вялікай сілы.

Апрача таго ім прыходзіцца прымаць спецыяльныя меры, накшталт сталага курсіравання бронепаяздоў, пабудовы дзотаў па лініях чыгунак, вырубкі лесу на 50—100 метраў ад чыгункі. Паміж Бранскам і Унечай акупанты паспрабавалі нават паставіць па абодвух баках чыгункі плот, каб перашкодзіць доступу партызан.

Але вопыт паказаў ужо: ніякімі спецыяльнымі мерамі, ні аховай, якой-бы вялікай у колькасных адносінах яна ні была, не ўдаецца спыніць налёты партызан на камунікацыі. Савецкія партызаны разумеюць, што танкавы або пяхотны полк—вялікая сіла на полі бітвы; знаходзячыся-ж у эшалоне, у дарозе да месца прызначэння, такі танк безабаронны і можа быць знішчан невялікім атрадам або групай партызан.

Партызанская вайна на камунікацыях усё больш узмацняецца.

Акупанты вымушаны трымаць усюды гарнізоны і няспынна ахоўваць усе ваенныя аб'екты, базы, склады, масты, чыгуначныя лініі, аэрадромы. Нідзе, апрача як у распалажэнні вялікіх гарнізонаў, немцы не могуць з'яўляцца па аднаму або невялікімі групамі. Для кожнай справы патрабуецца ўзброеная ахова. Апрача таго трэба вылучаць сур'ёзныя сілы для барацьбы з партызанскімі атрадамі.

Летам і ўвосень 1942 года вялі барацьбу супроць савецкіх партызан 144 паліцэйскіх

батальёны, 27 паліцэйскіх палкоў, 8 іншых палкоў, 10 ахоўных паліцэйскіх і карных дывізій «СС», 2 ахоўныя карпусы, у тым ліку мотакорпус «Кнацы», 72 спецыяльныя часці і да 15 палявых дывізій. Супроць партызан таксама дзейнічалі 102, 105, 108, 109 і 119-я венгерскія дывізіі.

У першыя месяцы вайны гітлераўскія «прапагандысты» імкнуліся рознымі спосабамі даказаць, быццам партызанская барацьба — не народны рух, а дзеянні асобных «злонамераных элементаў»; саміх партызан акупанты спрабавалі выставіць перад насельніцтвам у непрыглядным выглядзе. Цяпер яны вымушаны ў газетах, брашурах, афіцыйных настаўленнях і інструкцыях зрабіць прызнанне аб сапраўдных памерах, характары і значэнні народнага партызанскага руху.

У выданых германскім камандаваннем «10 запаведзяў германскага салдата аб барацьбе з партызанамі» запісана проста:

«Мы, немцы, дапускаем тую памылку, што калі няма наступлення або абароны, то наогул лічым, што няма вайны. Але вайна не спыняецца і ідзе тады, калі мы едзем у поле за фуражом, калі смажым бульбу і калі ідзем спаць».

А ў адным з загадаў па венгерскай дывізіі запісана літаральна наступнае:

«Не прымаць стравы ў мясцовага насельніцтва да таго часу, пакуль не спрабуе гаспадар, таму што страва можа быць атручана.

Начаваць у вёсцы па аднаму не дазваляецца: могуць зарэзаць або забіць. Калі сяляне просяць паказаць вінтоўку, не даваць: могуць забіць».

«Дэйчэ альгемейне цэйтунг» 22 мая 1943 года пісала:

«Тэрыторыя, якая знаходзіцца ўдоўж верхняга цячэння Заходняй Дзвіны, Бярэзіны, Прыпяці і Днепра, акаймлёна гарадамі Мінск, Пінск, Гомель, Бранск, Смаленск і Віцебск. Тут звілі гняздо бальшэвіцкія партызанскія атрады, якія ў тыле нашай арміі разгарнулі самую жорсткую барацьбу. Многія з іх вельмі добра ўзброены і забяспечаны радыёапаратамі, аўтамашынамі і разнастайнымі ваеннымі матэрыяламі. Яны вядуць жорсткую барацьбу з нямецкімі акупацыйнымі войскамі, пагражаючы падвозу, чыгуначнаму руху і нашай аднаўленчай рабоце.

Нельга адмаўляць, што гэтая барацьба каштуе нам вялікіх ахвяр, скоўвае частку нашых сіл і прыносіць нам сур'ёзныя страты. Бальшэвіцкія партызанскія атрады маюць добра арганізаваную, старанна заканспіраваную і самую цесную разведвальную сувязь. У іншай непрыгляднай сялянскай хаце палявая жандармерыя знаходзіла надзвычай добры радыёапарат, які падтрымліваў сувязь з бліжэйшым партызанскім атрадам або з маскоўскім цэнтрам. Пад аховай начной цемры партызаны падпаўзаюць да чыгуначнага палатна, адвінчваюць рэльсы і

закладваюць міны замаруджанага дзеяння, а калі чыгуначны састаў, які нагружан ваеннымі матэрыяламі або вязе на радзіму салдат-адпускнікоў, ляціць пад адкос, яны кідаюць у вагоны ручныя гранаты, абстрэльваюць іх з аўтаматаў, а пасля бясследна знікаюць, быццам затануўшы ў лясным гушчары.

Удоўж міжсёлавых дарог партызаны, схаваўшыя ў лісцях дрэў, падпільноўваюць праязджаючыя аўтамашыны. Уначы яны здымаюць вартавыя пасты, нападаюць на чыгуначныя будкі, і, раней чым да месца падзеі на выстралы прыязджае атрад, партызаны паспяваюць знікнуць.

У гэтых месцах заўсёды трэба быць напагатове. Па абодвух баках дарогі і чыгуначнага палатна высякаецца лес на адлегласці 50—100 метраў для таго, каб лягчэй можна было назіраць за мясцовасцю.

На подступах да гарадоў, на ўскраіне вёсак дамы, як і чыгуначныя будкі, агароджаны высокімі платамі з байніцамі, месцамі агароджаны калючым дротам, сігналы вежаў няспынна падтрымліваюць паміж сабой сувязь, усюды раз'язджаюць патрулі. У выніку амаль 25, а то і 30—35% людзей, выконваючых на працягу дня цяжкую работу, уначы павінны яшчэ несці ахову».

Надзвычай цікавым з'яўляецца прызнанне, зробленае венгерскім генеральным штабам у выданай ім афіцыйнай сакрэтнай брашуры «Аб

вопыце данай вайны». Ва ўступнай частцы раздзела, пад загалоўкам «Баі з партызанамі», проста гаворыцца, што партызанскі рух стаў ужо народным і набыў такі размах, які прымушае нахабных захопнікаў, згодна іх уласных слоў, «зжахацца». Вось гэты ўступ:

«Вайна супроць Саветаў пазнаёміла нас бліжэй з адным спецыяльным і бязлітасным сродкам ваеннай барацьбы — з партызанскім рухам. Гэты варварскі спосаб ваеннай барацьбы, па сутнасці справы, не з'яўляецца новым для нас. Мы пазнаёміліся з ім на сербскім тэатры вайны ўжо ў часе першай сусветнай вайны...

Аднак з боку рускіх народных мас, вядомых сваім мірным і пасіўным характарам, дабратой і глыбокай рэлігійнасцю, гэты рух быў для нас навіной; фанатызм, пагарда да смерці і ўпартасць, якую мы спаткалі ў рускага народа ў рамках гэтага спосабу вядзення вайны, здзівіла нас, а велізарны размах прымянення гэтага метаду прывёў нас у жах.

Партызанскі рух разгортваецца ва ўсё большых размерах, набыў ужо размеры народнага руху».

* * *

Асабліва бурны рост партызанскага руху пачаўся ў тыя дні, калі пад ударамі Чырвонай Арміі затрашчала германская ваенная машына. За зіму 1942—1943 года колькасць узброеных партызан вырасла ў два разы.

Зразумеўшы, якой вялізарнай стратэгічнай сілай у руках совецкага ваеннага камандавання з'яўляюцца партызанскія атрады, нямецкія акупанты з вясны 1943 года павялі шырокія ваенныя дзеянні супроць партызан. У многіх месцах супроць партызан накіраваны не толькі шматлікія спецыяльныя часці, але і кадравыя пяхотныя дывізіі з прымяненнем танкаў, авіяцыі і артылерыі. Напрыклад у маі гэтага года супроць бранскіх партызан дзейнічала цэлая 40-тысячная армія, у тым ліку 292-я мотапяхотная дывізія, 707 і 708-ы палкі 492-й пяхотнай дывізіі, 102-я мад'ярская пяхотная дывізія, група танкаў 18-й танкавай дывізіі, 3 дывізіёны артылерыі і 7 спецыяльных батальёнаў па барацьбе з партызанамі пры падтрымцы авіяцыі.

Да 30 тысяч варожых войскаў пры падтрымцы танкаў, артылерыі і бамбардыровачнай авіяцыі дзейнічаюць супроць адной буйнай групы партызанскіх атрадаў Мінскай вобласці.

Супроць партызанскага злучэння Героя Совецкага Саюза таварыша Г. у Смаленскай вобласці дзейнічалі часці 102-й пяхотнай дывізіі, кавалерыйская брыгада, 787-й, 264-й батальёны ўнутранай аховы, пад агульным камандаваннем генералаў Полле і Гобгартэна, пры падтрымцы танкаў, артылерыі і авіяцыі.

З буйнымі злучэннямі войск праціўніка няспынна змагаюцца і іншыя партызанскія атрады і злучэнні на Украіне, у Беларусі, у Сма-

ленскай, Орлоўскай, Калінінскай і Ленінградскай абласцях.

Нямецкае камандаванне прымала ўсе меры да таго, каб перад рашаючымі падзеямі на фронце летам 1943 года забяспечыць безапаснасць у сваім тыле, задушыць партызанскі рух шляхам шматлікіх буйных ваенных экспедыцый.

Вопыт паказвае, што такія буйныя экспедыцыі, як правіла, маюць сумны вынік для захопнікаў з прычыны высокіх баявых якасцей савецкіх партызан і поўнай перавагі іх тактыкі над тактыкай гітлераўскіх карацеляў.

Напомнім сталінскую ацэнку тактыкі немцаў: «Іх тактыка шаблонная, паколькі яна імкнецца падагнаць падзеі на фронце пад той або іншы параграф статута. Немцы акуратныя і дакладныя ў сваіх дзеяннях, калі абстаноўка дазваляе здзяйсняць патрабаванні статута. У гэтым іх сіла. Немцы становяцца бездапаможнымі, калі абстаноўка ўскладняецца і пачынае «не адпавядаць» таму або іншаму параграфу статута, патрабуючы прыняцця самастойнага рашэння, не прадугледжанага статутам. У гэтым іх асноўная слабасць».

Бяссілле нямецкіх часцей, дзеючых супроць партызан, заключаецца іменна ў тым, што яны не могуць у вайне супроць партызан дзейнічаць напэўна, па загадзя складзеных дыспазіцыях, па загадзя складзеных пунктуальных планах аперацый, дзе метадычна прадугледжа-

на ўсё, да самых падрабязнасцей, згодна статута.

У кожнай вёсцы, у кожным лесе, у кожнай складцы мясцовасці кожная гадзіна і кожны дзень нямецкіх карацеляў сустракаюць неспадзяванасці, не прадбачаныя ніякімі статутамі. Перавага тактыкі партызан заключаецца у тым, што гэтая тактыка аснована на сувязі з насельніцтвам, на асвядомленасці аб стане, палажэнні, руху праціўніка і яго сілах, аб бліжэйшых яго замыслах, аснована на манеўранасці, веданні мясцовасці, на нечаканай і знішчаючай сіле нападаў, на хутчэйшым сканцэнтраванні партызанскіх сіл для моцнага ўдару і безадкладным расчлененым вывадзе атрадаў з бою, калі гэта бывае неабходна, на самааддана́й узаемнай падтрымцы атрадаў, на геаічнай, не ведаючай меж, упартасці партызан у баі.

Не прымаючы лабавога ўдару буйных сіл, манеўруючы, нечакана з'яўляючыся ў тылах дзеючых нямецкіх часцей і злучэнняў, паражаючы сродкі кіравання сувязі і забяспечання гэтых часцей, увесь час знішчаючы немцаў, ставячы іх перад новым і нечаканым становішчам, партызаны дэзарганізуюць карацеляў, наносяць ім вялікія паражэнні.

Падавіць партызанскі рух буйнымі ваеннымі мерапрыемствамі акупанты бяссільны, яны самі вымушаны прызнацца ў гэтым.

У інструкцыі германскага генеральнага штаба па барацьбе з партызанамі, зацверджанай

фон Браухічам, прама гаворыцца, што вынікі дзеянняў буйных вайсковых злучэнняў супроць партызан часта не адпавядаюць чаканням.

Камандуючы венгерскай акупацыйнай групай, дзеючай супроць партызан (102, 105 і 108-я венгерскія пяхотныя дывізіі), у выданых ім «Кіруючых прынцыпах па барацьбе з партызанамі» пісаў:

«Асноўную прычыну нашых няўдач трэба шукаць у тым, што мы не ўлічылі ўсяго гэтага, вялі баявыя дзеянні прыстасавальна да метадаў вялікай вайны і хацелі пакончыць з партызанамі тактычнымі прыёмамі, якія скарыстоўваюцца ў вялікай вайне, у той час калі не трэба было рабіць нічога іншага, як, прыглядаючыся да метадаў барацьбы праціўніка, прымяняць іх супроць яго. 800 чалавек усходняй акупацыйнай групы, паўшыя геройскай смерцю,—гэта ахвяры, якія з'явіліся вынікам недастатковай увагі з нашага боку да партызанаў і да метадаў малой вайны».

Венгерскі военачальнік, не адзін раз біты партызанамі, зрабіў вывад, што тактыка партызан вышэй тактыкі акупантаў.

Захопнікі, зразумеўшы бяссілле буйных карных экспедыцый супроць усенароднага партызанскага руху з яго пераўзыходзячай тактыкай, хацелі-б у сваю чаргу перайсці на асновы партызанскай тактыкі. Гэтага патрабуюць многія нямецкія афіцыйныя інструкцыі. Дзе-ні-дзе немцы спрабуюць дзейнічаць невялікімі рухо-

мымі атрадамі, рабіць засады, нечакана нападаць, падпільноўваць партызан на маршы або на адпачынку.

Гэтыя бязглуздыя спробы канчаюцца звычайна знішчэннем нямецкіх груп; каб дзейнічаць па-партызанску, трэба мець за сабой народ.

* * *

Калі савецкі партызанскі рух вырас у грозную сілу, акупанты загаласілі на ўвесь свет аб незаконнасці такога спосабу барацьбы. Германскае інфармацыйнае бюро апублікавала паведамленне аб тым, што партызанская вайна не прадугледжана міжнародным правам і знаходзіцца ў супярэчанні з прынятымі правіламі вядзення вайны. Савецкія партызаны, гаворыцца ў паведамленні, не носяць адрозных знакаў: блях, кукардаў або павязак,—як тое, моў, рабілі ў свой час прускія партызаны; яны лічаць за лепшае добра маскіравацца і быць нязлоўнымі. Апрача таго партызаны быццам-бы жорстка абыходзяцца з захопленымі ў палон нямецкімі салдатамі і афіцэрамі.

Прыходзіцца прызнацца, што савецкія партызаны сапраўды ваююць не так, як таго хацелася-б гітлераўскай зграі. Яны нязлоўны. Яны не робяць вывесак, не патрэбны ім бляхі і кукарды. Яны замаскіроўваюцца і не даюць расстрэльваць сябе, як курапатак. Яны лічаць за лепшае расстрэльваць ненавісных акупантаў.

Гітлераўскія бандыты і забойцы, заліўшыя

крывёй акупіраваную імі зямлю, пасля таго як савецкія партызаны сталі метка і моцна іх біць, успомнілі і зашумелі аб міжнародным праве, аб правілах вядзення войн. Аб якіх правілах гавораць гітлераўскія разбойнікі?

Самі-ж яны растапталі ўсе правілы і ўсе нормы. Самі-ж яны стварылі агідную тэорыю татальнай вайны, якая апраўдвае ўсякія зверствы на акупіраваных тэрыторыях.

Савецкія партызаны—гэта патрыёты, стаўшыя са зброяй у руках на абарону сваёй бацькаўшчыны, гэта благародныя барацьбіты, маючыя высокае паняцце аб воінскай чэсці. Яны бязлітасны да гітлераўскіх акупантаў. Яны ўпартыя, страшныя і жорсткія ў баі, але яны ніколі не катуюць палонных. Яны захоўваюць ім жыццё. Нямецкім салдатам, а таксама салдатам васальных краін, якія дабравольна здаліся ў палон, безумоўна і ва ўсіх выпадках партызаны захоўваюць жыццё. Многа нямецкіх салдат і афіцэраў, захопленых у палон партызанамі, знаходзіцца ў лагерах для ваеннапалонных на савецкай тэрыторыі.

Больш таго, мы ведаем нямала выпадкаў, калі чэхі, славакі, венгры, палякі групамі, нават падраздзяленнямі пераходзілі да партызанаў, утвараючы партызанскія атрады для барацьбы з немцамі.

Трэба, аднак, сказаць, што салдаты і афіцэры нямецкіх і васальных армій, выкрытыя ў дзікіх зверствах, знішчэнні мірных жыхароў,

падпальванні сёлаў і вёсак, разглядаюцца партызанамі, не як салдаты непрыяцельскай арміі, а як бандыты і каты, знішчаюцца бязлітасна.

Напалоханыя размахам партызанскага руху, германскі, венгерскі і румынскі генеральныя штабы, галоўны штаб войск «СС» і штабы армій і злучэнняў, а таксама органы разведкі і контрразведкі, жандармерыі і гестапа ўзяліся за вывучэнне гісторыі партызанскай барацьбы у войнах Расіі і асабліва партызанскага руху ў цяперашняй айчыннай вайне, яго рухаючых сіл, арганізацыі, тактыкі. Паяўляюцца шматлікія інструкцыі, настаўленні, розны дапаможны матэрыял, памяткі па барацьбе з савецкімі партызанамі; адкрываюцца асобыя процiпартызанскія школы; павялічваецца колькасць спецыяльна навучаных каманд, часцей і злучэнняў для барацьбы з партызанамі, з той-жа мэтай арганізуюцца асобныя нямецкія ахоўныя дывізіі.

Побач з ваеннымі мерамі захопнікі прымяняюць больш складаныя прыёмы барацьбы супроць партызан, аснованыя на здрадніцтве, вераломстве і правакацыі. Галоўны з гэтых прыёмаў — засылка агентаў. Для разлажэння партызанскіх атрадаў знутры, для забойства каманднага састава ў часе бою ззаду, для дыскрэдытацыі комсастава, для выведвання баз, расналажэння сіл і ўзбраення атрадаў, сістэмы аховы і г. д.

У некаторых выпадках для пранікнення ў

атрады выкідаюцца правакацыйныя паветраныя дэсанты з радыстамі пад выглядам савецкіх груп. Практыкуецца засылка дзяцей, якія пад страхам смерці трэніруюцца ў спецыяльных дзіцячых школах. Часта засылаюцца для разведкі людзі, у якіх у заложнікі гестапа ўзяты сваякі; пад пагрозай знішчэння дзяцей маці прымушаюць ісці разведаць, што робіцца ў лесе, і г. д.

Але ў партызанскай разведкі, якая апіраецца на масы, ёсць тысячы і тысячы вачэй і вушэй адданых савецкіх патрыётаў, і калёным жалезам выпальвае яна язвы здрадніцтва іншы раз у самым зародышы.

Для таго, каб выклікаць незадаволенне насельніцтва супроць партызан, немцы дзе-ні-дзе арганізавалі ілжэпартызанскія атрады, якія грабяць насельніцтва пад выглядам партызан. У нямецкіх проціпартызанскіх школах выкладаецца агентам спецыяльны «прадмет»—«Меры па азлабленню насельніцтва супроць партызан». «Прадмет» рэкамендуе аграбленне і падпалы вёсак, забойствы асобных грамадзян і нават груп, згвалтаванне жанчын, пазбаўленне магчымасці займацца сельскагаспадарчай работай на гародзе і ў полі, бяссэнсоўны забой жывёлы і коней, марадзёрства, дзе толькі можна. Прычым галоўную ўвагу рэкамендуецца звяртаць на афармленне злачынстваў так, каб пераканаць, што гэта не правакацыйная работа групы гестапа, а справа рук партызан.

І гэтая правакацыя поспеху не мае. Насельніцтва хутка і ва ўсіх выпадках разбіраецца, хто прыяцель і хто вораг. Пры актыўнай дапамозе мясцовых жыхароў партызанскія атрады вельмі хутка знішчалі ілжэпартызан, выкрывалі і каралі смерцю здраднікаў, якія прабраліся ў атрад для дыскрэдытацыі яго шляхам марадзёрства і здзекаў з совецкіх людзей. Тысячамі ніцей звязаны партызаны з насельніцтвам, на яго апіраюцца ў барацьбе, у яго чэрпаюць дапамогу, рэзервы, сілу.

Партызаны нікому не дазваляюць крыўдзіць насельніцтва і за марадзёрства наказваюць смяротнай карай.

У весну 1943 года гітлераўскія акупанты ўжылі шырокі правакацыйны манеўр супроць партызан. Яны ўсюды раскідалі зварот, быццам-бы ад совецкага камандавання. Са знадворнага боку гэтая паперка рабіла ўражанне совецкага дакумента. Пачынаўся «зварот» са слоў «смерць нямецкім акупантам» і канчалася подпісам «камандуючы арміяй прарыву». У «звароце» гаварылася аб перамогах Чырвонай Арміі, аб неабходнасці разгрому гітлераўскіх акупантаў, згуртаванні ўсіх сіл. Далей указваліся партызанам задачы, якія зводзіліся да наступнага:

1. «Задача—прарыў усіх партызан да сталіцы Польшчы і разрыў гэтым шляхам фронту нямецкіх войск—павінна падначаліць сабе ўсё».

2. «Дробныя геаічныя атрады нашых слаўных партызан не могуць, нажаль, проціпаставіць сябе вялікім ордам фашыстаў. Таму задача дня—арганізацыя буйных партызанскіх атрадаў і накапліванне магутнай народнай партызанскай сілы».

3. «Скаплівайцеся на базах, залягайце і чакайце загаду аб выступленні ўпэўнена і спакойна.

Загад будзе даны, калі збярэм ураджай, а рэкі і азёры зноў пакрыюцца лёдам».

Гітлераўскія бандыты разлічвалі, што совецкія партызаны пойдуць на гэтую вудачку, павераць правакацыі і ператвораць геаічныя партызанскія атрады ў многатысячныя скапленні. Гэта было-б вельмі наруку немцам, бясcільным супроць шматлікіх, самастойна дзеючых партызанскіх атрадаў. Нямецкія правакатары, якія падрыхтоўвалі да вясны буйныя карныя экспедыцыі разлічвалі, што партызаны, паверыўшы заклiку, выйдуць з лясоў Украіны і Беларусі і накіруюцца, адрываючыся ад баз і знаёмых месцаў, «перадавой арміяй на Варшаву», гэта значыць насустрач падрыхтаваных пастак.

І зусім зразумелым стаў правакацыйны характар лістоўкі, калі яна паракамендавала партызанам залягаць на базах і чакаць, пакуль «рэкі і азёры пакрыюцца лёдам». Гэтае месца выклікала нямала вясёлых мінут у партызан.

Такога прымітыўнага глупства партызаны не чакалі нават ад тупагаловых немцаў.

Совецкія партызаны маюць іншыя каналы і спосабы атрымання дырэктыў і загадаў. Няма ніводнага выпадку, ніводнага атрада, дзе-б гэтая правакацыйная лістоўка была прынята за чыстую манету.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы таварыш Сталін у маі 1943 года даў загад:

«Партызанам і партызанкам—наносіць магутныя ўдары па варожых тылах, шляхах зносін, воінскіх складах, штабах і прадпрыемствах, разбураць лініі сувязі праціўніка. Уцягваць шырокія пласты совецкага насельніцтва ў захопленых ворагам раёнах у актыўную вызваленчую барацьбу, выратоўваючы тым самым совецкіх грамадзян ад угону ў нямецкае рабства і ад знішчэння гітлераўскімі звярамі. Помсціць бязлітасна нямецкім захопнікам за кроў і слёзы нашых жонак і дзяцей, матак і бацькоў, братоў і сясцёр. Усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў яе барацьбе з подлымі гітлераўскімі прыгнятальнікамі».

Загад таварыша Сталіна натхняе совецкіх людзей, якія часова знаходзяцца пад ярмом гітлераўскіх разбойнікаў, на новыя подвігі ў імя вызвалення радзімы.

Совецкія партызаны не забываюць, што нямецкія акупанты трымаюць яшчэ ў сваіх руках большую частку Украіны, Беларусь, Латвію, Літву, Эстонію, Малдавію і некаторыя іншыя

раёны нашай радзімы, што мільёны савецкіх людзей стогнуць пад крывавым ярмом фашызма, што кожны дзень акупацыі азначае нечуваныя зверствы ворага, знішчэнне савецкіх людзей, угон іх у нямецкае рабства, знішчэнне нацыянальных багаццяў СССР.

Савецкія партызаны цвёрда памятаюць, што перамога ніколі не прыходзіць сама, што яе трэба заваяваць. Сазнаючы свой абавязак перад радзімай, партызаны самаадддана выконваюць загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна. Бязлітасна помсцяць яны прыгнятальнікам за кроў і слёзы савецкіх людзей, усімі сіламі дапамагаюць Чырвонай Арміі.

Жорсткія бітвы, якія зараз адбываюцца на франтах айчыннай вайны, яшчэ больш павышаюць ролю і адказнасць савецкіх партызан. Самаадданая барацьба нашых войск на Орлоўска-Курскім і Белгародска-Курскім напрамках, сарваўшых генеральнае наступленне немцаў і перайшоўшых затым у наступленне супроць варожых войск у раёне Орла, натхняе савецкіх партызан на новыя подвігі ў славу радзімы. Дабіцца ўзаемадзеяння з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі, разбураць варожыя камунікацыі і склады, зрываць перакідку войск і тэхнічных сродкаў гітлераўцамі ў раёны баявых дзеянняў, знішчаць шляхі адыходу варожых войск—неадкладныя задачы партызан у сучасны момант. Сур'ёзным абавязкам савецкіх

партызан з'яўляецца таксама аказанне дапамогі наступаючым чырвонаармейскім часцям у правядзенні разведкі сіл праціўніка.

Няма сумнення, што совецкія партызаны з чэсцю выканаюць пастаўленыя перад імі задачы. Вораг адчуе на сабе сілу яшчэ больш знішчальных і няспынных ударау Чырвонай Арміі і совецкіх народных мсціўцаў.

★

## РАЗГАРАЕЦЦА ПОЛЫМЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ У БЕЛАРУСІ

Зграя фашысцкіх забойцаў, крывяжэрных драпежнікаў у вобразе чалавека, захапіла частку Совецкай Беларусі. Забойцы жанчын і дзяцей, рабаўнікі і гвалтаўнікі, нізкія і агідныя, азвярэлыя гітлераўскія сабакі крывавымі кіпцюрамі ўпіваюцца ў цела і душу беларусаў, якія асталіся на захопленай тэрыторыі. Няма такога бруднага злачынства, перад якім спыніліся-б гэтыя людаеды. Пагалоўны грабеж насельніцтва, расстрэлы, права на якія дадзена кожнаму салдату, забойствы жанчын, старых і дзяцей, дзікія гвалты над жанчынамі, катаванні — пачуццё агіды і непрымірымай злосці выклікаюць гэтыя дзеянні гвалтаўнікоў.

Непрымірымай, не на жыццё, а на смерць, партызанскай барацьбой адказвае свабодалюбівы беларускі народ крывавым прыгнятальнікам.

Верныя сваёй дактрыне запалохвання і ўціску народа куляй, катаваннем і канцэнтрацый-

нымі лагерамі, фашысты літаральна на другі дзень прыходу арганізавалі канцэнтрацыйныя лагеры. Усе працаздольныя заганяюцца за дрот, утрымліваюцца ў агідных умовах, кормяцца поліўкай з каніны адзін раз у два дні.

У загадзе нямецкага камандавання пад № 441 запісана: «Карміцца яны павінны самымі прымітыўнымі сродкамі, напрыклад, конскім мясам; якасныя, якія маюць каштоўнасць, жыццёвыя прадукты (кофе, чай, тутунь і г. д.) ні ў якім выпадку не павінны ім выдавацца». Тое-ж распаўсюджваецца і на ваеннапалонных.

Сетка канцэнтрацыйных лагераў фашыстамі пашыраецца. Трапіўшых туды прымушаюць працаваць дзень і большую частку ночы. Зняволеных у лагеры прымусілі будаваць мост праз Бярэзіну ў Бабруйску і аэрадром у Пухавічах; пасля сканчэння работы ўсе былі расстраляны.

Агідныя злачынствы фашысцкіх людаедаў перавышаюць па свайму цынізму і крывяжэрнасці ўсё, што ведала да гэтага часу гісторыя. Самыя змрочныя інквізітары сярэдніх вякоў здаюцца вучнямі ў параўнанні з фашысцкімі кваліфікаванымі катамі-забойцамі.

У ноч на 29 чэрвеня ў калгас «Новае жыццё» нечакана ўварваліся нямецкія танкі. Афіцэры схапілі старшыню сельсовета і старога калгасніка Нікалаенка Аляксандра Данілавіча

і патрабавалі, каб яны назвалі ўсіх членаў сельсовета, калгасных брыгадзіраў і звеннявых, комсамольцаў і комуністаў. Пасля таго, як два схопленыя патрыёты адмовіліся наадрэз выдаць таварышоў, іх прывязалі да двух танкетак і адарвалі ім рукі і ногі. Прысутныя сяляне таксама адмовіліся выдаць фашыстам актывістаў калгаса. Тады каты схапілі семярых старыкоў-калгаснікаў, звязалі вяроўкай і, па камандзе фашысцкага афіцэра, раздушылі іх танкамі. Цэлую ноч каты мучылі астатніх захопленых калгаснікаў і гвалтавалі дзяўчат.

У сяле Ляды пасля разгрому крамаў п'яныя афіцэры патрабавалі, каб насельніцтва даставіла ў бліжэйшы лес 18 дзяўчат. Калі калгаснікі адмовіліся выканаць патрабаванні фашыстаў, бандыты сілай зброі забралі дзяўчат, у тым ліку дзяўчынак 13—14 год, пацягнулі ў лес, згвалцілі, а потым расстралялі.

У Барысаўскім раёне немцы адабралі ў сялян ўсё, што мае хоць якую-небудзь каштоўнасць. У сяле Бытча гэтага раёна быў зроблены пагалоўны вобыск. Фашысты забралі не толькі прадукты харчавання, але ўзламалі куфры, забралі адзенне, абутак і г. д. Што нельга было забраць, або адправіць у Германію, немцы знішчылі.

Кожнаму нямецкаму салдату дадзена права пасылаць дамоў пасылкі з награбленымі рэчамі. У большасці забітых нямецкіх афіцэраў меліся кніжкі-абавязацельствы германскага

банка, куды яны здавалі грошы, выручаныя за награбленыя рэчы.

У кніжках былі адзнакі аб пераличэннях, якія рабіліся палявымі казначэйствамі ў Чэхаславакіі, Югаславіі, Польшчы, Францыі. Шлях грабежніка адзначаны ў яго чэкавай кніжцы.

Усюды ў захопленых месцах пачынаюцца бяспрыкладныя абрабаванні сялян і вываз прадуктаў у Германію. Немцы забіраюць хлеб, мяса, тутунь, лён — усё што трапіць пад руку. Адчуваючы вострую патрэбу ў гаручым, фашысты ўсюды адбіраюць газу, выліваюць яе ў многіх дамах проста з лямпаў.

У той-жа час ведамства Гебельса, не шкадуючы фарбаў, каб распісаць магутнасць германскай зброі, выдумляе розныя спосабы прапаганды, каб запалохаць, абязволіць, пазбавіць нашых людзей ініцыятывы барацьбы.

Напрыклад, пры захопе ў палон раненага камандзіра, або чырвонаармейца каты з гестапа і ведамства Гебельса дэманстрыруюць на вачах насельніцтва аказанне раненым медыцынскай дапамогі, праяўляюць адзнакі ўвагі і спачування, даюць піць, курыць і г. д. Затым, мяркуючы, што належны эфект міласэрдзя зроблены, выводзяць раненых за сяло, пазверску зрываюць з іх толькі што накладзеныя павязкі, катуюць і расстрэльваюць.

Але ніякімі зверствамі, рабункамі, расстрэламі, катаваннямі, канцэнтрацыйнымі лагерамі фашысцкім катам не ўдаецца і ніколі не

ўдасца зламаць дух, волю да перамогі мужнага беларускага народа. Гэты народ праз вякі пранёс сваю культуру, свой горды дух, сваю любоў да свабоды і нянавісць да заваявальнікаў. Беларускі народ не адзін раз на працягу вякоў бачыў захопнікаў, але яны ніколі не змаглі зламаць гэтага народа, які меў заўсёды цяснейшыя кроўныя сувязі з брацкім рускім і ўкраінскім народамі.

Немцаў беларусы добра памятаюць па 1918 годзе. Тады кайзераўскія зграі таксама прабавалі ўтапіць беларускі народ у патоках крыві. Не ўдалося. Да гэтага часу помняцца нямецкім акупантам штыкі, вілы, косы, сякеры беларускіх партызан. І цяпер увесь беларускі народ падняўся на абарону сваёй роднай зямлі, Радзімы, сваёй маёмасці, сваіх жонак, матак і дзяцей ад крывавых лап людаедаў. Усё шырэй разгараецца полымя свяшчэннай айчыннай вайны. Зямля пачынае гарэць пад нагамі захопнікаў. Азвярэлы вораг траціць упэўненасць і, прабуючы схавацца перад жахам народнай расправы, узмацняе крывавы тэрор.

Кожны дзень прыносіць усё новыя і шматлікія прыклады гераічнай барацьбы беларускіх партызан. Вось толькі некалькі фактаў гэтай барацьбы, бо ўсіх пералічыць няма магчымасці.

Партызанскі атрад пад кіраўніцтвам дырэктара спіртзавода і сакратара Р-скага райкома партыі, які складаецца з рабочых і калгасні-

каў, напаў на нямецкую калону. Пяхота была знішчана. Атрадам захоплены адзін танк, 10 бронемашын і адна супроцьтанкавая гармата. На машыны пасаджаны трактарысты і кулямётчыкі, і атрад, узброены адбітымі машынамі, вядзе самаадданую барацьбу з фашыстамі.

Партызанскі атрад пад кіраўніцтвам сакратара К-скага РК КП(б)Б узяў з налёту горад, знішчыў гарнізон, пратрымаў у сваіх руках горад да прыбыцця буйнага нямецкага атрада, потым знік. Затым партызаны зноў напалі на ворага і занялі раённы цэнтр К., знішчыўшы там немцаў. Цяпер атрад праводзіць важную аперацыю пад Х.

Н-скі партызанскі атрад у схватцы з ворагам знішчыў нямецкі танк, забіў 30 нямецкіх кавалерыстаў, спаліў 3.000 тон награбленага фашыстамі хлеба і склад гаручага. Апрача таго, узарваны 2 масты ў тыле немцаў. Атрад працягвае дзейнічаць далей.

Н-скі партызанскі атрад выявіў у лесе штаб нямецкага злучэння пад моцнай аховай. Выклікаўшы воінскую часць, партызаны разам з ёй напалі і знішчылі штаб. Многа салдат і афіцэраў забіта, у тым ліку генерал. Штабныя дакументы і група палонных афіцэраў перададзены партызанамі савецкаму камандаванню.

Н-скі партызанскі атрад у раёне Баянавіч высачыў ішоўшую нямецкую пяхоту. Прапусціўшы яе праз масты, партызаны ўзарвалі

чатыры пантонныя пераправы праз раку Пціч, а затым сумесна з загадзя выкліканай воінскай часцю напалі на пяхоту. Забіта больш 1.000 нямецкіх салдат; невялікая частка фашыстаў разбеглася па лясах і знішчаецца.

Н-скі партызанскі атрад прапусціў праз раку пяхоту, затым спаліў 2 пантонныя масты і знішчыў 300 перайшоўшых раку нямецкіх салдат.

Н-скі аб'яднаны атрад знішчыў агнём і ў воўчых ямах 30 танкаў і бронемашын ворага. Тры браневікі, пакінутыя ўцёкшымі танкістамі, паступілі на ўзбраенне атрада. Гэты атрад заняў Парычы і затым Глуск, разбіўшы гарнізоны ворага.

У вёсцы З. нямецкія танкісты, якія вылезлі з танкаў, былі закіданы гранатамі, і ўцякалі, пакінуўшы танкі і згубіўшы каскі. Калгаснікі знішчылі танкі і пайшлі ў лес. Вёска затым была спалена немцамі.

У Н-скім раёне партызаны ўзарвалі масты і надоўга затрымалі эшалоны ворага.

Па Варшаўскаму шасе ад дзяржграніцы да Бабруйска ляжыць велізарная колькасць разбітых і спаленых партызанамі машын. Кожны дзень на гэтым шасе ў розных месцах узнікаюць жорсткія сутычкі партызан з немцамі.

У вёсцы Студзянка нямецкі афіцэр з групай салдат сабраў сялян і звярнуўся з прамовай. У адказ з натоўпу раздаўся стрэл, і афіцэр быў забіты напавал. Сяляне пайшлі ў лес

у партызанскі атрад. Вёска спалена немцамі дашчэнту.

Калгаснікі ордэнаноснага калгаса імя Беларускай асобай ваеннай акругі два дні біліся з нямецкай пяхотай на тэрыторыі роднага калгаса, затым пайшлі ў лясы, захаваўшы незгасальную нянавісць да ворагаў і волю да барацьбы. Фашысцкія канібалы калгас спалілі.

Такіх фактаў вельмі многа, але яшчэ больш іх астаецца невядомымі. Кожны дзень узнікаюць сотні новых атрадаў, адбываюцца тысячы нападаў партызан на ворага, на масты, на сувязь, транспарт ворага, склады і г. д. Сяляне, якія не пайшлі яшчэ ў партызанскія атрады, дапамагаюць атрадам чым толькі можна, служаць разведчыкамі, наводзяць партызан на ворага, называюць партызанам здраднікаў з рэшткаў разбітага кулацтва. Такіх здраднікаў партызаны знішчаюць бязлітасна, як і фашыстаў.

Нямецкае камандаванне выдала загад, як забараняе войскам спыняцца ў лясах. Загад рэкамендуе размяшчацца на адпачынак толькі ў полі, маскіравацца і выстаўляць вялікую ахову. У крайнім выпадку, гаворыцца ў загадзе, перад прыпынкам у лесе лес трэба прастрэльваць з кулямётаў і, калі магчыма, з гармат.

Страх перад партызанамі нервуе салдат, выматвае, парушае правільны рух калон, а напад выклікае паніку ў калонах і сціск, ад якога

салдаты і маёмасць гінуць не менш, чым ад куль.

Цікавыя хітрыкі прыдумалі немцы, каб схаваць свае велізарныя страты, якія наносяцца ім Чырвонай Арміяй і партызанамі. Калі забіта 200—300 салдат, дык немцы збіраюць усе трупы, закапваюць, прыдаюць гэтым могілкам выгляд невялікай магілы, ставяць крыж і пішуць на ім: «Пад гэтым крыжам ляжыць такі-та салдат» (часамі пішуць 2—3 прозвішчы). Але і гэты спосаб не можа ўтаіць страт: пад адным толькі Бабруйскам немцы вымушаны былі паставіць каля 300 такіх крыжоў.

Як відаць з раду захопленых штабных дакументаў, нямецкае камандаванне вельмі сур'ёзна ўстрывожана ростам партызанскага руху і рэкамендуе цэлы рад захадаў, устанаўляе новы парадак руху па дарогах, каб вырватавацца ад udараў партызан.

Не дапаможа! Партызаны ўзнікаюць падобна грому і, знішчыўшы ворага, знікаюць, як дым. Ужо многія танкавыя нямецкія часці загінулі без гаручага, бо партызаны знішчылі яго на шляхах падвозу.

Усё шырэй і шырэй разрастаецца партызанская вайна ў Беларусі. Рабочыя, калгаснікі і інтэлігенты, беспартыйныя, комуністы і комсамольцы — усе, хто можа насіць зброю, бяруць яе ў рукі і выступаюць на вялікі фронт свяшчэннай Айчыннай вайны. Беларускі народ

ведае, што ён не адзінокі, што магутная Чырвоная Армія, вялікі рускі, украінскі і іншыя народы Совецкага Саюза падняліся на ненавіснага смяротнага ворага. Гэта надае нашаму народу сілу, бадзёрасць і ўпэўненасць у перамозе.

Час поўнага разгрому і знішчэння ворага чалавецтва — германскага фашызма — недалёк. Як у 1812 г., калі Беларусь першай стала арэнай дзеянняў напалеонаўскай арміі, а затым з'явілася магілай гэтай арміі, так і цяпер, прымаючы ў ліку першых удары ўзброенага да зубоў драпежнага, вераломнага ворага, Беларусь стане магілай фашызма.

★

## БЕЛАРУСКІ НАРОД У БАРАЦЬБЕ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ

У выніку Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі, пасля разгрому і выгнання нямецкіх інтэрвентаў у 1918 годзе, дзякуючы падтрымцы і дапамозе вялікага рускага народа, з рук вялікіх Леніна і Сталіна ўпершыню за сваю гісторыю Беларусь атрымала дзяржаўную самастойнасць.

Годы савецкай улады ў Беларусі — гэта годы бурнага росту вытворчых сіл рэспублікі, будаўніцтва прамысловасці, росквіту сельскай гаспадаркі, росту гарадоў і рабочага класа, небывалага ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця насельніцтва горада і вёскі, яркага росквіту нацыянальнай культуры і мастацтва.

22 чэрвеня фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. Беларусь у ліку першых прыняла на сябе ўдар германскай ваеннай машыны.

Немцы, захапіўшы Беларусь, перш за ўсё ліквідавалі яе дзяржаўную самастойнасць.

Яны не імкнуліся нават стварыць падабенства марыянетачнай дзяржавы з дапамогаю контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай агентуры, добра разумеючы, што такія спробы былі-б немінуча асуджаны на правал.

Адным з першых актаў нямецкіх акупантаў у Беларусі было стварэнне Мінска-Баранавіцкай акругі, начале з фашысцкім губернатарам Вільгельмам Кубэ, які праславіў сябе дзікімі п'янымі оргіямі, гвалтамі над жанчынамі і грабяжамі. Затым была створана так званая «мясцовая ўлада». Для арганізацыі яе немцы прыцягнулі з сабой усё прагніўшае, п'янае, сіфілітычнае белагвардзейскае падонне. Яны падабралі рэшткі разбітага кулацтва і бандыцка-крымінальны элемент. Гэтых прайдзісветаў немцы прызначаюць бургомістрамі гарадоў, старастамі і войтамі сёл і раёнаў. А над усім гэтым крымінальным збродам, які тэрарызуе насельніцтва, устаноўлена ўлада фашысцкіх ваенных камендатур.

Жудасныя злачынствы немцаў, якія зацямнілі ўсе зладзействы, якія толькі ведае гісторыя, — катаванні, масавыя забойствы, спальванне на вогнішчах дзяцей і жанчын, крывавыя оргіі карных атрадаў, жахі засценкаў гестапа — не запалохалі беларускі народ, не зламалі яго волі да барацьбы.

Беларускі народ па заклiку таварыша Сталіна падняўся на свяшчэнную Айчынную вайну з ненавісным ворагам і вядзе яе з усё на-

растаючай сілай — вайну не на жыццё, а на смерць, вайну партызанскую і вайну эканамічную.

Рабочы клас Беларусі ажыццявіў гіганцкую эвакуацыю прамысловасці. Вырашана было нічога не пакідаць ворагу. Сотні фабрык і заводаў Беларусі эвакуіраваны поўнасцю — з абсталяваннем, сыравінай і рабочай сілай — у глыб краіны. У пераважнай большасці выпадкаў яны ўжо аднавілі сваю работу. Сярод эвакуіраваных — такія прадпрыемствы, як гомельскі, магілеўскі і віцебскі станкабудаўнічыя заводы, маторабудаўнічы завод, ільнопрадзільны камбінат, фабрыка штучнага шоўку, фабрыкі «Кім» і «Сцяг індустрыялізацыі», буйнейшая добрушская папяровая фабрыка, мікашэвіцкі завод спецдраўніны, запалкавыя фабрыкі «Везувій» і «10-ці годдзе Кастрычніка» і многія іншыя фабрыкі і заводы.

Эвакуіраваны ўсе энергетычныя ўстаноўкі, турбіны, генератары, дызелі, у тым ліку і буйнейшая электрычная станцыя «Белдрэс». Вывезены ўвесь паравозны і вагонны парк. Эвакуіраваны вагонарамонтныя заводы і дэпоўскае абсталяванне.

Вораг пазбаўлены магчымасці арганізаваць за лік нашай прамысловасці рамонтна-аднаўленчыя майстэрні і заводы для сваіх танкаў, самалётаў і аўтамашын.

Рабочы клас Беларусі праявіў велізарную

вытрымку, гераізм і разуменне дзяржаўных інтарэсаў. Ворагу засталіся бязлюдныя, пакінутыя жыхарамі гарады.

Нямецкі афіцэр, захоплены ў палон, пісаў сваёй жонцы ў Мюнхен:

«Вось мы і ў Гомелі. Я кажу «мы» таму, што я так прывык табе пісаць, разумеючы пад «мы» нашу роту. Дзесяць дзён таму назад нас было сто трыццаць восем чалавек, зараз засталося восемнаццаць. Сёння ўвесь дзень блукалі па Гомелю ў надзеі знайсці што-небудзь для падарунка табе і для заспакаення ўласнага голаду. Дарэмна, у горадзе ўжо нічога няма».

У 1941 годзе ў Беларусі даспеў багаты ўраджай. Гэты ўраджай быў у поўным сэнсе слова пладом калгаснага ладу, пладом вялікай работы калгаснікаў, партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый Беларусі.

Галодныя фашысцкія сабакі разлічвалі падкарміцца і стварыць стратэгічныя запасы за лік гэтага ўраджаю. Заняўшы Беларусь, фашысты абвясцілі ўраджай і запасы харчавання ў насельніцтва ваеннай здабычай. Яны лічылі, што фактам акупацыі тэрыторыі аўтаматычна вырашаецца ў іх карысць пытанне аб рэсурсах гэтых тэрыторый, у прыватнасці, пытанне аб хлебе.

Аднак сапраўдныя гаспадары ўраджаю распарадзіліся ім інакш.

Ніякім тэрорам немцы не змаглі прымусіць калгаснікаў сабраць і аддаць ім ураджай. Сяляне не выйшлі на ўборку.

Разгарэлася самая жорсткая барацьба за хлеб, за бульбу, за тэхнічныя культуры, за тое, каб яны не дасталіся ворагу. Гэта барацьба з'явілася адной з вастрэйшых форм барацьбы калгаснікаў Беларусі за совецкую ўладу. Усе пасеўныя плошчы ільну і канапель былі знішчаны калгаснікамі на корані. Забяспечыўшы сябе мінімальнымі запасамі хлеба, калгаснікі спалілі і знішчылі ўвесь астатні хлеб. Па ўсёй Беларусі запалыхалі пажары. Вялікія пасевы бульбы засталіся ў зямлі і вымерзлі.

Вельмі шкада, вядома, было калгаснікам знішчаць здабыты іх сумленнай працай багаты калгасны ўраджай, але-ж калгаснікі перасілілі ў сабе гэтае пачуццё і вышэй за ўсё паставілі інтарэсы радзімы.

— Не аддамо ворагу хлеб і бульбу, няхай здыхае ён з голаду, — казалі ўсюды калгаснікі. — У нас будзе совецкая ўлада, — будзе і хлеб.

Перапалоханыя стратай ураджаю і грознай зданню наступаючага голаду, пераканаўшыся ў тым, што ніякімі сіламі не прымусіць калгаснікаў сабраць і аддаць ураджай, нямецка-фашысцкія нягоднікі рашылі захаваць і сабраць ураджай, ужыўшы шырокі правакацыйны манеўр супроць калгаснага сялянства. Яны

вырашылі часова захаваць для віду знешнюю форму калгасаў з агульнай працай, каб выцягнуць калгаснікаў на ўборку хлеба і сяўбу азімых.

Акупацыйныя ўлады выступілі са зваротам, заклікаючы калгаснікаў спыніць знішчэнне ўраджаю і выйсці на ўборачныя работы. Увесь ураджай павінен быць звезены ў грамадскія свірны, а восенню, — гаварылася ў зваротах, — мы дапаможам размяркаваць ураджай, і вы даведаецеся, што такое нямецкі парадак.

Правакацыйны манеўр не ўдаўся, ён быў разгаданы адразу. Шасцідзесяцігадовы калгаснік Іван Сямёнавіч Абражэвіч, з вёскі Рудня, Магілеўскай вобласці, на сагнаным сходзе сялян, звяртаючыся да немцаў, сказаў:

«Вы ў нас хлеб і што папала грабіце? Грабіце. Жанчын нашых ганьбіце? Ганьбіце. Людзей нашых расстрэльваеце? Расстрэльваеце. Калі гэта ў вас называецца новым парадкам, дык што-ж вы ў Германіі называеце бандытызмам і разбоем»?

Мужны патрыёт Абражэвіч паплаціўся жыццём. Яго адказ — адказ усяго беларускага сялянства.

Фашысты спадзяваліся атрымаць хлеб, аграбіць і вывезці яго. Не ўдалося — калгаснікі спалілі і знішчылі хлеб. Немцы хацелі мяса — калгаснікі сотні тысяч галоў жывёлы перагналі ў тылавыя вобласці Савецкага Саюза.

Беларускі народ усюды шырока разгарнуў бязлітасную партызанскую вайну з акупантамі. У Мінску, Гомелі, Віцебску, Беластоку, Брэсце, Гродне, у пушчах Белавежскай і Налібоцкай, у лясах Палесся і Аўгустоўскіх, на рэках Дняпры, Бярэзіне, Прыпяці, Нёмане, Сожы вядуць гераічную барацьбу многатысячныя партызанскія атрады.

Ніякія карныя экспедыцыі не змаглі зламаць сілы партызанскага руху, — наадварот, яны толькі спрыяюць яго далейшаму росту. Не дапамаглі і банды, якія арганізавалі немцы з крымінальнікаў і белагвардзейцаў. Гэтыя банды пачалі пад выглядам партызан грабіць насельніцтва з мэтаю дыскрэдытацыі партызанскага руху. Правакатары былі перабіты партызанамі пры дапамозе калгаснікаў.

Нязлічаны прыклады гераічных дзеянняў партызан.

Група партызан каля станцыі Старушкі пусціла пад адкос і затым узарвала фашысцкі бронепоезд.

Група гомельскіх партызан узарвала ўсе чыгуначныя масты, трубы і рад станцыйных будынкаў па чыгуначнай лініі Асіпавічы — Слуцак, фактычна закрыўшы лінію для руху.

Партызаны трох раёнаў, аб'еднаўшы свае сілы, знішчылі каля Васілевіч фашысцкі карны атрад.

Аднымі забітымі фашысты страцілі больш двухсот салдат і афіцэраў.

Партызанская група таварыша Б. на лініі Мінск — Асіпавічы пусціла пад адкос тры вайсковыя эшалоны.

Партызанскі атрад таварыша Х., які арганізаваўся 14 верасня, да 20 снежня знішчыў 283 нямецкіх салдаты і афіцэры, знішчыў 36 аўтамашын, 13 матацыклаў і адну аўтадрэзіну, пусціў пад адкос 4 вайсковыя эшалоны, знішчыў адну батарэю, якая складалася з трох гармат, разам з разлікамі, спаліў адзін баявы самалёт і адзін транспартны планер, пашкодзіў тэлефонную і тэлеграфную сувязь у 61 месцы, знішчыў 25 здраднікаў — нямецкіх стаўленікаў. У баявой схватцы партызаны разбілі і разагналі карны атрад гестапа, які налічваў 120 нягоднікаў.

Нямецкія гарнізоны адчуваюць сябе ў Беларусі, як у асуджаным лагеры. Нягледзячы на тэрор, кожную раніцу на вуліцах гарадоў і раённых цэнтраў знаходзяць трупы забітых нямецкіх салдат і афіцэраў.

Нястомна і бясстрашна працуюць падпольныя партыйныя арганізацыі. Як правіла, яны маюць друкарні. У іх яны друкуюць, а потым распаўсюджваюць весткі з радзімы, выдаюць газеты. Комуністы арганізуюць слуханне перадач з роднай Масквы. Комуністы-падпольшчыкі з'яўляюцца душою партызанскіх атрадаў.

У радзе раёнаў і вёсак, у тыле ў немцаў фактычна адноўлена Совецкая ўлада, фа-

шысцкія стаўленікі знішчаны і на чале стаяць старшыні райвыканкомаў і сельсоветаў.

Шнырыць гестапа, шукае падпольныя арганізацыі, партызанскія атрады, шукае тайныя прыёмнікі, абяцае ўзнагароды за вылаўліванне партызан, усімі сіламі імкнецца раздуць даносы, але ўсе дзеянні фашысцкіх нягоднікаў сустракаюцца магільным маўчаннем, натыкаюцца на непранікальную сцяну. Партызаны і падпольшчыкі — яны ўсюды і нідзе. Нябачныя і няспынныя ніці сувязей ідуць праз франты і абшары, ад партызан і падпольных арганізацый з Беларусі ў вялікі Совецкі Саюз і назад.

Вялікія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа. Беларусы ніколі не забудуць папялішчаў Мінска, Гомеля, Рагачова і сотень вёсак і сёл.

Яны не забудуць па-зверску замучаных бацькоў, матак, жонак, братоў і сёстраў, зняслаўленых і замучаных дзяўчат і растаптаных дзяцей. Не забудуць разграбленых калгасаў і калгасных хат. Яны нічога не забудуць і нічога не даруюць. Вялікі смутак народа перакаваўся ў вялікую нянавісць і помсту. Надыходзячая з няўмольнай сілай усенародная помста будзе страшнай. Яна не ведае граніц, яна не ведае ні літасці, ні жальбы. Усё, што прынеслі нямецкія звяры беларускаму народу, яны адчуюць у шмат разоў больш самі. Хто прышоў на нашу зямлю і хто накіроўваў іх у гэты паход, і тыя,

хто прымаў ад іх тое, што яны здзіралі з нашых плеч, адкажуць за ўсё і ў поўнай меры.

У агні Айчыннай вайны ўмацаваўся і загартаваўся беларускі народ. Тысячы герояў, бясстрашных і мужных, праслаўляюць радзіму і беларускі народ на палях баёў і ў барацьбе ў тыле. Народ Беларусі нарадзіў такіх сыноў, як Герой Савецкага Саюза капітан Нікалай Гастэла, як Герой Савецкага Саюза генерал Леў Даватар, як двойчы Герой Савецкага Саюза Сяргей Грыцавец, як Героі Савецкага Саюза партызаны Ціхон Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі. Яшчэ цясней згуртоўвае свае рады беларускі народ вакол партыі Леніна—Сталіна, партыі, з рук якой ён атрымаў сваю дзяржаўнасць, пад кіраўніцтвам якой дасягнуў небывалага росквіту.

У саюзе са сваім старэйшым братам, вялікім рускім народам, разам з брацкімі народамі вялікага Савецкага Саюза, пад кіраўніцтвам Сталіна беларускі народ будзе змагацца да поўнай перамогі, да поўнага знішчэння ворага.

Беларусь была і будзе савецкай!

★

## ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ТЫЛЕ Ў НЕМЦАЎ

3 ліпеня 1941 года таварыш Сталін даў у сваёй прамове баявую праграму дзеянняў партызан Айчыннай вайны:

«У занятых ворагам раёнах трэба ствараць партызанскія атрады, конныя і пешыя, ствараць дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны, усюды і заўсёды, для ўзрыва мастоў, дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, падпальвання лясоў, складаў, абозаў. У захопленых раёнах ствараць невыносныя ўмовы для ворага і ўсіх яго пасобнікаў, праследваць і знішчаць іх на кожным кроку, зрываць усе іх мерапрыемствы». **(Сталін).**

Насельніцтва часова занятых ворагам абласцей горача адгукнулася на заклік таварыша Сталіна. Разгарнуўся найшырэйшы партызанскі рух, узніклі тысячы партызанскіх атрадаў. Партызаны ператварыліся ў грозу для нямецкіх армій. Шматлікія атрады ўпісалі нямала

гераічных старонак у гісторыю вызваленчай вайны савецкага народа супроць акупантаў. Слава аб мужнасці і геройстве партызан, прыклады іх беззаветнага служэння Радзіме разнесліся па ўсім свеце.

Шырокая і шматгранная баявая дзейнасць партызанскіх атрадаў па знішчэнню жывой сілы і тэхнікі ворага.

Партызаны Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Малдавіі, Карэліі, Крыма і захопленых раёнаў Расійскай рэспублікі не даюць ні ўдзень, ні ўначы супакою грабежнікам і гвалтаўнікам. Партызаны знішчылі дзесяткі тысяч фашысцкіх салдат і афіцэраў, спалілі тысячы мастоў, пусцілі пад адкос сотні варожых цягнікоў, знішчылі тысячы машын, танкаў, гармат, кулямётаў, дзесяткі тысяч аўтаматаў, вінтовак і т. д. Яны знішчылі сотні штабаў, батальёнаў, палкоў, дывізій і нават, як гэта было пад Кіевам, на Украіне, і пад Жлобінам, у Беларусі, штабы корпусаў.

Партызаны бязлітасна знішчаюць здраднікаў радзімы, якія перайшлі на службу да ворага. Ніякай літасці яны не даюць здраднікам.

Удары, нанасімыя партызанамі па ворагу, становяцца ўсё больш адчувальнымі і кваліфікаванымі. Партызанскія атрады маюць велізарны вопыт вайны. Тактыка атрадаў з'яўляецца баявой наступальнай тактыкай. Партызаны не чакаюць ворага, яны шукаюць яго і знішчаюць. Партызаны сталі майстрамі раз-

ведкі, яны ведаюць, што робіцца навакол, ведаюць, дзе размешчаны штабы і сілы ворага, яны знаходзяць найбольш балючыя месцы, б'юць па іх і паведамляюць аб распалажэнні ворага часцям Чырвонай Арміі. Партызанскія атрады наносяць удары галоўным чынам там, адкуль вораг іх не чакае.

Скрытнасць і нечаканасць дзеянняў — характэрная асаблівасць партызанскай тактыкі.

Атрад пад камандаваннем тав. К., які дзейнічае ў Запарожскай вобласці, Украінскай ССР, зрабіў нечаканы налёт на часць «СС», у выніку якога забіта 104 германскіх салдаты і 3 афіцэры, знішчаны 231 веласіпед, захоплены ў палон 2 германскія матацыклісты і 5 афіцэраў, захоплена 2 мінамёты, 1 штабная легкавая машына і некалькі аўтаматаў.

Карыстаючыся шырокай падтрымкай насельніцтва, партызаны заўсёды добра інфармаваны аб прасоўванні варожых часцей, выбіраюць удалыя месцы для засад і пастак.

Атрад пад камандаваннем тав. П., які дзейнічае ў Сталінскай вобласці, Украінскай ССР, даведаўшыся, што ў сяло О. рухаецца калона нямецкай пяхоты да 2.000 чалавек, арганізаваў засаду і, падпусціўшы праціўніка на блізкую адлегласць, раптоўна адкрыў агонь. Страціўшы больш за 100 чалавек забітымі, уся двухтысячная калона немцаў кінулася бегчы.

Партызаны навучыліся змагацца і выходзіць пераможцамі ў баях з часцямі праціўні-

ка, узброенымі тэхнікай, танкамі, бронема-шынамі і г. д.

Партызанскі рух выпрацаваў прыёмы і так-тыку барацьбы з механізаванымі сіламі пра-ціўніка: воўчыя ямы на шляхах магчымага руху танкаў, бутэлькі з гаручай вадкасцю, звязкі гранат, мініраванне шляхоў, завалы ў лясах і спальванне танкаў у завалах, спаль-ванне танкаў, схаваных пад павецямі і г. д.

Асабліва распаўсюдзілі партызаны налёты на танкі ворага, размешчаныя ў населеных пунктах на рамонт або для адпачынку экіпа-жаў. Бліскучы прыклад такой аперацыі дае незабыўны подвіг беларускага партызана, Героя Совецкага Саюза тав. Бумажкова, які знішчыў 18 танкаў разам з экіпажамі. Такі-ж гераічны подвіг зрабіў партызанскі атрад пад камандаваннем тав. Г. — партыйца аднаго з калгасаў Сумскай області, Украінскай ССР. Гэты атрад нечакана наляцеў на сяло А. і спаліў 16 варожых танкаў.

Вельмі многія атрады маюць на сваім бягу-чым рахунку дзесяткі баявых аперацый, знач-ныя і рознастайныя трафеі.

Партызанскі атрад тав. М., які дзейнічае на тэрыторыі Беларусі, толькі ў снежні 1941 го-да правёў наступную баявую работу: узарваў 2 чыгуначныя масты і 2 масты спаліў, замініраваў палатно чыгуначнай дарогі і пусціў пад адкос воінскі эшалон, зрабіў начны напад на ваенную камендатуру і паліцэйскую ўправу ў

горадзе К. Пры нападзе былі забіты 10 афіцэраў, 39 салдат, перакладчык, 2 паліцэйскія і 1 здраднік. Атрад знішчыў 2 самалёты праціўніка, якія зрабілі вымушаную пасадку. Атрад спачатку налічваў 24 чалавекі, зараз вырас да 230 чалавек і працягвае расці далей, узбройваючыся за лік трафеяў. За ўвесь час страты атрада: забітых — 1 чалавек, лёгка параненых — 2 чалавекі.

Атрад тав. С. у складзе 125 чалавек з 1 кастрычніка дзейнічае ў раёнах Віцебскай вобласці, Беларускай ССР, Смаленскай і Калінінскай абласцях. Атрад за гэты час меў 21 сутычку з ворагам. Партызанамі атрада знішчана: нямецкіх салдат і афіцэраў—230 чалавек, грузавых машын з ваеннымі матэрыяламі—43, штабных машын і матацыклаў—4, павозак з ваеннымі матэрыяламі—22, коней—86, палкавых мінамётаў—3, скрынак з патронамі—163, мін—120. Узарваны склад з артылерыйскімі снарадамі, узарвана 3 масты, парвана тэлеграфна-тэлефонная сувязь у 43 месцах на працягу 19 кіламетраў і ўзарвана лінія чыгункі на поўдзень ад станцыі Л.

Знішчаны 3 здраднікі, якія выдалі немцам партызан і чырвонаармейцаў.

Гэты атрад, як і многія іншыя, адначасова праводзіць вялікую палітыка-растлумачальную работу сярод насельніцтва. У 120 населеных пунктах пабывалі агітатары з партызанскага

атрада, у раёнах іх дзейнасці ўзніклі яшчэ 3 новыя атрады.

Ёсць атрады, якія налічваюць ужо 5—6-месячны баявы стаж, іх аперацыі становяцца ўсё больш смелымі і ажыццяўляюцца ў шырокіх маштабах. У ходзе баёў партызанскія атрады ўстанаўліваюць сувязі паміж сабой, і ў выпадках, калі сілы ворага намнога перавышаюць сілы аднаго атрада, яны аб'ядноўваюцца і знішчаюць ворага сумесным сакрушальным ударам.

Партызанскі атрад «Большэвік», Гомельскай абласці, Беларускай ССР, пачаў дзейнічаць 20 жніўня 1941 года. Ён звязаны з 7 іншымі атрадамі і праводзіць велізарную баявую і палітычную работу. Вось далёка няпоўны пералік баявых дзеянняў атрада: на Чэрнігаўскім шасе атрад знішчыў 2 семітонныя аўтамашыны з салдатамі. Атрад правёў на гэтым-жа шасе буйную аперацыю, разграміўшы аўтакалону з дзесяткаў машын, на цэлы дзень спыніў рух па шасе. Для аднаўлення руху немцы вымушаны былі зняць з фронта і кінуць на шасе бронетанкавую часць..

Атрад, пранікнуўшы у г. Гомель, узарваў 2 цэхі вагонарамонтнага завода, дзе немцы рамантавалі танкі і аўтамашыны. Больш дзесятка танкаў згарэлі. Партызаны ўзарвалі склад боепрыпасаў па Інтэрнацыянальнай вуліцы.

Выключны па доблесці, геройству і тактычнаму майстэрству прыклад паказаў партызан-

скі атрад тт. К. і Б., якія дзейнічаў у Маскоўскай вобласці. Разведка атрада ўстанавіла месцазнаходжанне штаба буйнага вайсковага злучэння нямецкай арміі. Партызанскі атрад колькасцю ў 47 чалавек вырашыў для правядзення аперацый звязацца яшчэ з 2 атрадамі, якія дзейнічалі ў раёне. На нарадзе камандзіраў атрадаў дагаварыліся аб сумесных дзеяннях па разгрому нямецкага штаба.

Дакладнай разведкай, у час якой партызаны і партызанкі праніклі нават у кватэры, дзе жылі афіцэры штаба, быў выяўлены распарадак работы штаба, размяшчэнне пастоў аховы, лік аховы і наяўнасць агнявых сродкаў, час спынення руху, размяшчэння бензасховішчаў, складаў, рамонтных баз, бронемашын, скопішча грузавога і легкавога транспарта; былі атрыманы дакладныя весткі аб месцы раскватаравання аддзяленняў штаба, аддзяленняў гестапа і г. д. Пасля дакладнай падрыхтоўкі ў 2 гадз. 15 мінут ночы зводны партызанскі атрад, разбіты на 8 груп, зрабіў напад на 8 раней вызначаных галоўнейшых аб'ектаў, дзе быў раскватараваны штаб. Уварваўшыся ў размяшчэнне ворага, партызаны абстралялі галоўны будынак з аўтаматаў і вінтовак і закідалі яго гранатамі. Некалькі будынкаў штаба было падпалена. Немцаў, якія выбягалі і рабілі спробы схавацца, расстрэльвалі растаўленыя пры выхадзе з вёскі і на

скрыжаваннях дарог патрулі. Аперацыя працягвалася 1 гадзіну 10 хвілін.

Штаб вайсковага злучэння ворага быў поўнасцю знішчаны. Страты праціўніка склалі: 600 салдат і афіцэраў забітымі і параненымі, 80 грузавых і 23 легкавых аўтамашыны, 5 матацыклаў, 4 сярэднія танкі, 1 бронемашына, 12 коней, 12 павозак, спалены вялікі склад з гаручым і абоз з боепрыпасамі, 2 павозкі з пасылкамі і боепрыпасамі. Атрадам былі таксама захоплены аператыўныя дакументы, якія перададзены штабу Заходняга фронту.

Страты зводнага партызанскага атрада — 18 чалавек забітымі і 8 чалавек параненымі.

Гэтыя буйныя аперацыі — сведчанне нарастаючай сілы партызанскага руху.

Душой гэтага руху з'яўляюцца камуністы.

У большасці сваёй гэта самыя адважныя байцы, нястомныя арганізатары ўсенароднай барацьбы супроць нямецкіх акупантаў. Праз камуністаў партызанскія атрады звязаны з падпольнымі партыйнымі арганізацыямі, якія нястомна і бясстрашна працуюць у варожым тыле. Атрады праводзяць вялікую палітычную работу сярод насельніцтва, друкуюць у сваіх друкарнях і распаўсюджваюць лістоўкі, брашуры, праводзяць сходы працоўных, чытаюць калгаснікам прамовы таварыша Сталіна, расказваюць аб поспехах Чырвонай Арміі, выкрываюць правакацыйныя, хлуслівыя выдумкі

нямецкай прапаганды, арганізуюць слуханне радыёперадач з роднай Масквы.

Партызанскі рух высунуў выдатнейшых байцоў — кіраўнікоў атрадаў, якія праславілі сябе геранчнымі справамі. Прыдзе час — і аб іх імёнах і справах даведаецца ўся краіна.

Нямецкае камандаванне ў плане «маланкавай вайны» разлічвала, што яно ў кароткі тэрмін зможа метадамі тэрора, правакацыі і хлуслівай прапаганды стварыць устойлівы тыл у чужой краіне. Яно выключыла магчымасць сур'ёзнага ўплыву партызанскай барацьбы на вынік вайны.

У ліпені 1941 года нямецкія прапагандысты, якія вельмі любяць выхваляцца, абвясцілі партызанскую барацьбу міфам, выдумкай савецкай і англійскай прапаганды. У гэты-ж час немцы жорсткім тэрорам, спальваннем цэлых населеных пунктаў, масавымі расстрэламі за ўдзел у партызанскім руху або за дапамогу партызанам імкнуліся нагнаць страх на насельніцтва, утрымаць яго ад удзелу ў партызанскай барацьбе. Гэтай мэце служыла і хлуслівая прапаганда, задача якой заключалася ў тым, каб выклікаць у насельніцтва ўражанне аб непераможнасці нямецкай арміі, стварыць уражанне, што з Чырвонай Арміяй усё скончана, што быццам яна поўнасцю знішчана і што немцы падыходзяць да Урала.

Але ніякія карныя атрады, ніякія зверствы, хлусня і правакацыі не змаглі зламаць магут-

най сілы народнага партызанскага руху. Наадварот, нямецкія агідныя злачынствы толькі садзейнічалі яго павелічэнню. Не дапамаглі гітлераўцам арганізаваныя імі банды з крымінальнікаў і белагвардзейцаў з мэтай дыскрэдытацыі партызанскага руху. Гэтыя банды, якія рабавалі насельніцтва пад выглядам партызан, бязлітасна знішчаюцца народнымі мсціўцамі.

Жыхары гарадоў і сёл масамі сталі ісці ў партызанскія атрады.

У жніўні 1941 года, скаштаваўшы жорсткіх ўдараў партызанскіх атрадаў, нямецкае камандаванне і ведамства Гебельса прыкметна змяняюць тон. З'яўляюцца шматлікія лістоўкі, загады, звароты па радыё да насельніцтва акупіраваных абласцей з патрабаваннем спыніць партызанскую барацьбу, а партызанам — выйсці з лясоў. У нямецкіх газетах з'яўляюцца «скаргі» на «непрадугледжаную ніякімі правіламі вядзення вайны партызанскую барацьбу». Нямецкае камандаванне вымушана было заявіць афіцыйна, што яно разглядае партызанскую вайну, якая разгарнулася на занятай тэрыторыі, як супярэчачую міжнароднаму праву, чым канчаткова абвергла свае-ж сцверджанні аб тым, што партызанскай вайны на занятых тэрыторыях няма.

У тысячах салдацкіх лістоў родным адлюстраваўся страх немцаў перад партызанамі. Лісты поўныя скаргі на тое, што нямецкаму

салдату нельга ні ў адзіночку, ні нават невялікай групай адыйсці ад часці; у лістах і афіцыйных дакументах прыводзяцца шматлікія факты страт ад партызан.

Рух партызан вырас у такую сілу, што ўжо нельга было захаваць ні яго сапраўдных памераў, ні яго ўсенароднага характару. А з кастрычніка нямецкае камандаванне вымушана лічыцца з партызанскім рухам, як з фактарам, які ўяўляе сур'ёзную пагрозу для арміі акупантаў.

У нашы рукі трапіў важны дакумент стаўкі галоўнага камандавання германскай сухапутнай арміі, які носіць назву «Асноўныя палажэнні па барацьбе з партызанамі». Гэты дакумент, зацверджаны фон-Браухічам і разасланы да батальёнаў, прадстаўляе падрабязнейшую інструкцыю аб мерах барацьбы супроць совецкіх партызан і насельніцтва, якое ім спачувае. Да інструкцыі прыкладзена нават скарочаная гістарычная даведка аб партызанскіх войсках на тэрыторыі Расіі. Вымушаныя прызнанні германскага камандавання вельмі далёкі ад таго, што яшчэ так нядаўна распаўсюджвала германская прапаганда, балбочучы аб безгрунтоўнасці партызанскага руху.

Увесь дакумент пранікнуты глыбокай незахаванай трывогай, пачуццём страху перад велізарным партызанскім рухам, які разгарнуўся ў тыле нямецка-фашысцкіх войск.

«Партызанская барацьба з арміяй, якая ўступае на рускую зямлю з мэтай паслаблення гэтай арміі з'яўлялася ва ўсіх вядомых выпадках гісторыі сапраўдным сродкам у руках рускага ваеннага камандавання. З вялікім поспехам гэты метад барацьбы ўжываўся супроць варагаў, татар, шведаў, Напалеона і супроць германскіх армій у сусветную вайну. У цяперашнюю вайну рускае камандаванне таксама шырока ўжывае гэты метад барацьбы. Рускія партызаны наносяць удары не толькі па дробных вайсковых часцях і злучэннях дзейных войск, але і парушаюць забеспячэнне і сувязь у тылавых раёнах. Яны таксама ў форме нямецкіх войск зблiжаюцца з салдатамі і падрываюць іх баявы дух...»

Германскае камандаванне не можа ўжо больш адмаўляць шырачэзнага размаху і народнага характару партызанскага руху, таксама як і таго, што гэты рух наносіць велізарныя страты, падрывае баявы дух нямецкіх салдат.

У інструкцыі асабліва падкрэсліваецца, што «партызанскія атрады арганізуюцца працаўнікам або стыхійна ствараюцца вакол прызначанага камандзіра з мясцовых жыхароў».

У бяссільнай злосці супроць партызан немцы свядома і планамерна арганізуюць масавае знішчэнне насельніцтва.

У дырэктыўнай частцы інструкцыі германскае камандаванне абавязвае вылучыць сур'-

ёзныя вайсковыя сілы для падаўлення партызанскага руху і рэкамендуе страшэнна агідныя прыёмы правакацый, тэрора і запалохвання. Войскам даецца простае ўказанне аб крывавай расправе не толькі з партызанамі, але і з усім насельніцтвам; кожнаму салдату даецца права без суда і следства забіваць кожнага, хто здасца яму спачуваючым партызанам.

«Поўная рашучасць знішчыць партызан і ім спачуваючых з'яўляецца часта не пад сілу нават для самага чорствага салдата. Правільна пастурае той, — цынічна павучае германскае камандаванне, — хто, поўнасцю пагарджаючы асабістымі пачуццямі, дзейнічае бязлітасна і бессардэчна».

Фашысцкія вырадкі рэкамендуюць вядзенне разведкі праз мясцовых жыхароў і прымушаюць іх да гэтага сродкамі тэрора: «Адбірайце ў маткі двух-трох дзяцей, пасылайце яе ў разведку з папярэджаннем, што калі яна не прынясе вестак аб партызанах,—дзеці будуць расстраляны».

Жывёльны страх перад партызанамі, якія смела аперыруюць на нямецкіх камунікацыях, у інструкцыі выяўлены ў поўнай забароне мясцоваму насельніцтву якога-небудзь руху па дарогах. Адпаведны пункт інструкцыі гаворыць:

«Войскі павінны ачысціць дарогі, трымаць дарогі свабоднымі ад руху па іх жанчын,

дзяўчат і падлеткаў. Лозунгам павінна быць— ачысціць дарогі ад рускіх».

У мэтах палепшання аховы чыгунак прадпісваецца спальванне і знішчэнне ўсіх будынкаў і хутароў, якія размешчаны вакол чыгуначных шляхоў.

Германскае камандаванне да тонкасцей распрацоўвае метады ажыццяўлення людаедскіх загадаў Гітлера аб знішчэнні рускай нацыі, украінцаў, беларусаў і ўсіх іншых народаў, якія насяляюць Совецкі Саюз.

У барацьбе з партызанамі немцы імкнуцца падшукаць шпіёнаў з мясцовых жыхароў для выяўлення месцазнаходжання партызан. Згодна інструкцыі «арганізуецца перасоўванне нямецкіх салдат, адзетых у грамадзянскую вопратку, пеша, або на кані, або на транспартных павозках пад выглядам мясцовых жыхароў». Але партызаны застаюцца няўлоўнымі.

Германскі генеральны штаб вымушаны быў з мэтай папярэджання сваіх войск прызнаць нямала горкіх ісцін.

Напрыклад, у інструкцыі мы чытаем аб тым, што вялікая аперацыя з увядзеннем у бой некалькіх батальёнаў з прыданымі атрадамі звычайна служаць для знішчэння вялікіх атрадаў праціўніка. Але, дадае інструкцыя, «поспех гэтых аперацый амаль заўсёды не адпавядае чаканням, бо праціўнік расколваецца на часткі, прасочваецца на вялікай тэрыторыі або ў лясах скрозь наступаючыя часці, затым зб-

раецца ва ўмоўленым месцы і наносіць нечаканыя ўдары».

Не апраўдалі сябе і прыёмы барацьбы з партызанамі ў лясах. Інструкцыя з жалем адзначае, што «аб прачэсванні лясоў існуе часта няправільнае ўяўленне. Прачэсванне магчыма толькі на дробных плошчах і на асобных маленькіх участках. Большыя-ж масівы прачасаць не прадстаўляецца магчымым з прычыны адсутнасці сіл».

У інструкцыі запісана таксама, што «тактычная разведка і разведка боем на маршрутах і пры іншых аперацыях трацiць сваё значэнне з прычыны незвычайнай рухавасці партызан, яна вядзе толькі да папярэджання партызан і перашкаджае раптоўнасці нападу на іх».

Канстатуецца ў інструкцыі і тое, што «франтальная атака на партызан рэдка прыносіць поспех».

Такім чынам, германскі генштаб вымушаны прызнаць бяссілле немцаў перад партызанамі, якія хаваюцца ў лясах, беспаспяховасць дзеянняў супроць партызан вялікімі атрадамі нямецкіх войск, безнадзейнасць франтальных атак супроць партызан.

Такія каштоўныя прызнанні ворага, запісаныя ў афіцыйным дакуменце германскага галоўнага камандавання.

Ва ўсіх загадах па фашысцкіх часцях і злучэннях, пачынаючы ад палка і да арміі, якой бы аперацыі не быў прысвечаны загад, дзеян-

нікам партызан і мерам перасцярогі супроць іх адводзіцца віднае месца. Па-рознаму гучаць у загадах радкі, якія адносяцца да партызан. Тут ёсць усё, ад злосна-бяссільных заўваг аб тым, што «салдаты не трымаюцца маіх указанняў аб перасцярозе супроць партызан на маршах і пры размяшчэнні на адпачынку, што прыводзіць да вялікіх страт», як гэта напісаў у загадзе забіты фашысцкі камандзір 31-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант фон-Кохенгаузен, і да бяспрыкладнага па подласці, бессаромнасці і жорсткасці загада адпраўленага ўжо на той свет галоўнакамандуючага 6-й германскай арміяй фон-Рэйхенау.

Сухія пункты загадаў вельмі красамоўна ілюструюцца шматлікімі сведчаннямі з боку тых, хто адчуў на сабе непасрэдна сілу агню і праслаўленыя штыкавыя ўдары партызан.

У сумцы забітага партызанамі нямецкага лейтэнанта Рорбаха з часцей Гудэрыяна, знойдзена пісьмо лейтэнанта да яго былога дырэктара:

«Вы пытаецеся, якой я думкі аб чырвоных партызанах. Я магу толькі сказаць, што іх паводзіны ў часе боя неспасцігальныя. Не гаворачы аб настойлівасці, хітрасці і садысцкіх метадах бою, аб чым у Вас там, напэўна, вядома, самае значнае ў іх — гэта нечуваная ўпартасць. Я асабіста бачыў даволі часта сваімі вачыма, калі яны ў часе атакі, ня гледзячы на мацнейшы і сканцэнтраваны агонь, не лі-

чылі патрэбным адыходзіць або нават лажыцца. Гэта гучыць непраўдападобна, але я даволі часта бачыў гэта сам. Гэтыя паводзіны тлумачацца, па-мойму, не толькі дзеяннямі камісараў і камісараў, якія стаяць за імі, а ў першую чаргу гэта — прадукт бальшэвіцкага выхавання і выражэнне бальшэвіцкага светапогляду».

Пісьмо не патрабуе каментарыяў.

Партызанскі рух цяпер уступае ў новую фазу. Многія ўдарныя групы праціўніка разбіты на франтах. Нямала фашысцкіх злучэнняў перасталі існаваць як боездольныя адзінкі. Парадзелі дывізіі, падарваны наступальны дух і падае дысцыпліна сярод нямецкіх салдат. Фашысцкая армія на радзе участкаў адступае пад ударамі часцей Чырвонай Арміі.

У гэтай абстаноўцы, якая робіць значна больш лёгкай партызанскую барацьбу супроць акупантаў, важнейшай задачай совецкіх партызан з'яўляецца перарэзванне ўсіх шляхоў адступлення фашысцкіх бандытаў. Партызаны павінны пераразаць чыгуначныя шляхі, узрываць шляхі, масты, пускаць пад адкос эшалоны, не даваць немцам вывозіць награбленае дабро і баявую тэхніку, пераразаць усе шасейныя шляхі, будаваць завалы, заторы, мініраваць дарогі, знішчаць ахову, узрываць, спальваць, падпілоўваць масты, рабіць усюды засады, знішчаць салдат і афіцэраў, нападаць на штабы, на вузлы сувязі, аэрадромы, знішчаць

самалёты, гаручае, машыны, павозкі ворага, адбіраць яго тэхніку і паварочваць яе супроць яго-ж. Арганізоўваць усюды ў вёсках, у сёлах баявыя заслоны, якія павінны магутным, сакрушальным агнём адбіваць падраздзяленні і часці фашысцкай арміі пры іх спробах спальваць, рабаваць населеныя пункты і забіраць з сабой насельніцтва. Трэба шырэй заклікаць жыхароў усюды хаваць, закопваць, несці ў лясы маёмасць, хаваць жывёлу, каб ўратаваць яе ад грабежніцтва і знішчэння фашысцкімі захопнікамі, у першую чаргу хаваць сякеры, пілы, рыдлёўкі, ламы, каб іх не скарысталі фашысцкія гвалтаўнікі для абарончых работ. Вось над чым павінны цяпер працаваць партызанскія атрады і падпольныя партыйныя арганізацыі, якія дзейнічаюць у тыле ворага.

Нямецка-фашысцкія каты павінны адказаць і адкажуць за ўсё перад нашым вялікім народам.

Свяшчэннае полымя ўсенароднай партызанскай барацьбы разгарэлася з нябачанай сілай.

Партызаны і партызанкі не дадуць выйсці жывым з нашай зямлі ні аднаму захопніку.

Грозная для ворага армія савецкіх партызан ідзе ў рашучыя бai за поўнае знішчэнне фашысцкіх акупантаў.

★

## БЕЛАРУСЬ ЗМАГАЕЦЦА

Ніколі яшчэ за ўсю сваю нацыянальную гісторыю беларускі народ не падвяргаўся такой сур'ёзнай небяспецы, як цяпер. Прабыванне пад нямецка-фашысцкім ярмом азначае для беларускага народа не толькі страту ўсякай свабоды і нацыянальнай самастойнасці, не толькі жабрацкае, паўгалоднае, рабскае існаванне, але і проста фізічнае знішчэнне. Гутарка ідзе ў поўным сэнсе гэтага слова аб жыцці або смерці нацыі.

Нямецка-фашысцкія акупанты планамерна, з неймавернай жорсткасцю знішчаюць мірнае насельніцтва Беларусі сіламі сваіх воінскіх часцей, ужываючы ўсе сродкі сучаснага бою. У горадзе Петрыкаве немцы расстралялі большую частку жыхароў, а дзяцей жывымі ўтапілі ў рацэ. У Ельску немцы пасадзілі на баржу больш за 500 жанчын і дзяцей, шэсць дзён вазілі іх галоднымі па рацэ Прыпяць, а затым утапілі. У Суражы немцы загналі 700 чалавек у замініраваны роў. Уцалеўшых пасля разрыву мін яны расстралялі з аўтама-

таў. У Шклове немцы расстралялі 6.000 мужчын і жанчын, а дзяцей жывымі кінулі ў ямы разам з забітымі бацькамі і закідалі зямлёй. Тры дні над магіламі варушылася зямля — пахаваныя жывымі дзеці паміралі ў страшных пакутах.

Такія-ж масавыя расправы былі зроблены акупантамі ў Мінску, Віцебску, Оршы, Лёзне, Брэсце, Чэрвені, Глуску, Слуцку, Быхаве, Бешанковічах, Бабруйску, Полацку, Лельчыцах і іншых гарадах і сёлах Беларусі. Немцы закатавалі, расстралялі, павесілі і жывымі спалілі больш за 700 тысяч жыхароў Беларусі. Цяпер нямецкае камандаванне падрыхтоўвае новыя масавыя расправы над людзьмі Савецкай Беларусі. Па спісах, складзеных гестапа і мясцовымі нямецкімі камендатурамі, фашысты збіраюцца знішчыць усіх старшынь сельскіх саветаў, членаў сельсаветаў, старшынь калгасаў, брыгадзіраў, звеннявых і іншых сельскіх актывістаў. Тая-ж частка насельніцтва Беларусі, якая ўцалела пасля гэтых жудасных расправаў, асуджана фашыстамі на катаржную, паднявольную працу, голад і павольнае выміранне.

Ва ўсіх гарадах і сёлах Беларусі запанавала бяскрайняя беднасць. Хлеб у калгаснікаў адабраны, жывёла, якая знаходзілася ў іх асабістым карыстанні, адбіраецца поўнасцю. Адсутнічае ўсякі гандаль. Калі селянін і рызыкне прынесці ў горад якія-небудзь прадукты

для абмену, гэтыя прадукты ў яго ўсёадно адбяруць нямецкія салдаты. Фашысцкія акупанты са звярынай упартасцю разбураюць або вывозяць у Германію ўсё, што было створана беларускім народам, усё, што накапіла насельніцтва за многія гады сваёй працы. Ваенны транспарт, які абслугоўвае франты, ідзе назад у Германію, нагружаны награбленым дабром беларускага народа. Немцы вывозяць усё жалеза, якое толькі можна сабраць, пачынаючы ад другіх чыгуначных калей, канчаючы дзвярнымі клямкамі, пасудай. Спецыяльныя каманды па збору метала адбіраюць у сялян усе металічныя прадметы ўжытку. Вывозіцца лес, сыравіна. Нямецкія салдаты адпраўляюць у Германію многа пасылак з рэчамі, адабранымі ў насельніцтва.

Немцы адбіраюць цяпер у народа галоўную крыніцу багацця калгаснай Беларусі — зямлю, заваяваную Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыяй і навечна замацаваную за калгасамі совецкай уладай. Прыбалтыйскі памешчык барон Розенберг ад імя германскага ўраду аб'явіў «новы парадак» землекарыстання, канчаткова завяршаючы поўнае абрабаванне і заняволенне сялянства. Паводле гэтага «парадку» у калгаснікаў адбіраюцца ўсе правы на зямлю. Зямля пераходзіць ва ўласнасць акупантаў і раздаецца нямецкім памешчыкам і каланізатарам, на якіх павінны працаваць сялянскія абшчыны. Для членаў

абшчынаў устанаўліваецца кругавая парука, яны ва ўсім павінны падпарадкавацца нямецкім кіраўнікам.

Германскія акупанты стварылі галоўную германскую зямельную ўправу і раённыя германскія зямельныя ўправы, якія з'яўляюцца апаратам ваенна-прыгонніцкай арганізацыі сельскай гаспадаркі. На чале гэтых упраў стаяць фашысцкія афіцэры. Нямецкія памешчыкі, як саранча, наляцелі на зямлю Беларусі. У пошуках лепшых маёнткаў яны шныраць па ўсёй беларускай зямлі, арганізуючы памешчыцкія гаспадаркі. У многіх выпадках гэтыя фашысцкія панкі сілай зброі спрабуюць прымусіць сялян прысягаць на рабскую вернасць ім.

Гэты «новы парадак» азначае ўстанаўленне прыгоннага права, у сто разоў горшага, чым тое, якое існавала ў Расіі да 60-х гадоў мінулага стагоддзя. «Парадак» гэты зводзіць калгаснае сялянства да ўзроўню бязмоўных рабоў, якія не маюць ніякіх правоў, апрача права выміраць ад жабрацтва і голаду. Адначасова немцы спрабуюць скарыстаць насельніцтва Беларусі для рабскай працы ўнутры самой Германіі. Усюды арганізаваны так званыя вярбовачныя бюро, якія ўзначальваюцца нямецкімі афіцэрамі. Спецыяльныя воінскія каманды, якія ёсць пры гэтых бюро, гвалтоўна, пад пагрозай зброі адпраўляюць беларусаў на германскую катаргу.

Захапіўшы Беларусь, немцы ліквідавалі яе дзяржаўную самастойнасць. У пачатку яны стварылі Мінска-Баранавіцкую акругу на чале з фашысцкім губернатарам, уключыўшы яе ў «Остланд» — агульнагерманскую правінцыю—пратэктарат. Затым Беларусь была перайменавана ў «Беларутэнію». Па думцы гітлераўскіх дурняў гэтая назва павінна была ні больш ні менш, як сцерці памяць аб гістарычна ўсталёванай еднасці і дружбе беларускага народа з вялікім рускім народам і з'явіцца такім чынам выгадным мосцікам для ўсякага роду гістарычных фальсіфікацый. Беларусь, у якой адабрана дзяржаўная самастойнасць, крамсаецца на часткі. Цяпер чатыры яе заходнія абласці ўключаны немцамі ў так званую «Ост-Зюйд Прусен», г. зн. паўднёва-ўсходнюю Прусію.

Ці трэба гаварыць, як беларускі народ ненавідзіць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сваіх прыгнятальнікаў, сваіх катаў, якія залілі крывёю зямлю яго радзімы! На кожным кроку захопнікі сустракаюцца з гераічным супраціўленнем сыноў і дачок вольнай савецкай Беларусі. З кожным днём усё новыя і новыя жыхары гарадоў і вёсак бяруцца за зброю для непрымірымай і бязлітаснай, не на жыццё, а на смерць, барацьбы з акупантамі.

У чатырох раёнах адной вобласці адбылося ўсенароднае выступленне супроць нямецкіх акупантаў. Насельніцтва перабіла ўсю фашысцкую агентуру, знішчыла і выгнала ня-

мецкія гарнізоны і аднавіла органы совецкай улады. Немцы былі вымушаны кінуць сюды буйныя сілы, у тым ліку адну пяхотную дывізію. Жорсткія баі ў гэтых раёнах паміж насельніцтвам, партызанамі і нямецкімі акупантамі працягваюцца.

Дні і ночы сотні партызанскіх атрадаў, тысячы невялікіх груп і адзіночак партызан-знішчальнікаў беззаветна б'юцца з ворагамі радзімы. У ходзе вайны партызанскі рух узняўся на вышэйшую ступень. Узмацнілася ўзбраенне партызан, яны ў дасканаласці авалодалі тактыкай партызанскай барацьбы, загартаваліся і выраслі іх кіраўнікі. Цяпер партызаны, якія аб'ядноўваюцца некалькімі атрадамі, усё часцей нападаюць на буйныя нямецкія гарнізоны, знішчаючы іх. Так, беларускі партызанскі атрад пад камандаваннем тав. Д. і атрад невельскіх партызан разграмілі гарнізон немцаў з 400 чалавек, які стаяў у вёсцы Лехава. Тут быў узарваны склад з боепрыпасамі, спалены машыны і г. д. Гэты-ж атрад тав. Д. выбіў нямецкі гарнізон з вёскі Блічна. Немцы ўцяклі, страціўшы забітымі 80 чалавек.

Партызанскі атрад тав. Ш., які пачаў сваю баявую работу ў складзе 14 чалавек, цяпер вырас у беларускую партызанскую брыгаду,— грозную для ворага сілу, якая ўступае ў бой з цэлымі часцямі немцаў. Брыгада знішчыла 1.300 нямецкіх салдат, 60 афіцэраў, аднаго генерала, 200 паліцэйскіх і стараст, 50 аўта-

машын з грузамі і людзьмі, адну бронемашыну, 50 мастоў, вызваліла ад захопнікаў 15 сёл, арганізавала і накіравала ў рады Чырвонай Арміі да 5.000 беларусаў. Партыйная арганізацыя брыгады правяла сярод насельніцтва двух раёнаў падпіску на пазыку і здала 200 тысяч рублёў у фонд абароны краіны.

Наколькі адчувальныя для ворага ўдары беларускіх партызан, відаць з прызнанняў саміх немцаў. Камандаванне танкавай нямецкай групы ў сваім загадзе за № 415/42 «Што тычыцца барацьбы з партызанамі» прызнае, што цяпер у Беларусі наглядаецца сур'ёзнае ўзмацненне партызанскага руху, «які прымае такія памеры, што ўзнікае сур'ёзная небяспека для забеспячэння фронта». У другім пункце загада гаворыцца, што «ўсе мерапрыемствы па захопу і знішчэнню партызанскіх атрадаў не давалі вынікаў». У загадзе запісана: «Трэба прымірыцца з тым, што толькі ў вельмі рэдкіх выпадках удавалася захапіць партызанскія групы, ёсць магчымасць толькі разладзіць іх дзейнасць або трывожыць іх, але гэта ўжо з'яўляецца поспехам».

Гэты загад, як і інструкцыя генеральнага штаба па барацьбе з партызанамі, загады Рэйхенау, загад Гімлера па ўсёй гестапаўскай перыферыі і шмат іншых вядомы партызанскім атрадам, якія бяруць з іх для сябе ўсё, што ім неабходна. Больш таго, гэтыя загады і інструкцыі часта становяцца вядомымі пар-

тызанам раней, чым яны даходзяць да тых, каму прызначаны. Загад па танкавай групе, выпушчаны штабам арміі 19 сакавіка, 24 сакавіка быў ужо ў распараджэнні партызанскіх атрадаў. Камандаванне танкавай групы сабрала ў Віцебску нараду бургамістраў гарадоў і старшынь валасцей для абмеркавання пытання аб мерах барацьбы з партызанскім рухам. На нарадзе, якая ішла два дні, былі распрацаваны самыя дакладныя інструкцыі і планы барацьбы з партызанамі, але партызаны даведаліся аб гэтых планах і інструкцыях раней, чым бургамістры і старшыні валасцей паспелі вярнуцца ў свае гарады і сёлы.

Якім чынам усё гэта адбываецца, — гаварыць цяпер, вядома, не варта. Але само сабой зразумела, што такая інфармаванасць партызан магчыма толькі таму, што яны ўсюды сустракаюць дружную падтрымку з боку насельніцтва, поўнага нянавісці да ворага.

У многіх гарадах і раённых цэнтрах Беларусі на расклееных па вуліцах загадах, зваротах і плакатах нямецкага камандавання і міністэрства прапаганды ў адну ноч былі пастаўлены штампы: «Яўная нямецкая хлусня». Цэлы дзень гестапаўцы, паліцэйскія і чыноўнікі на радасць насельніцтва здзіралі са сцен і платоў свае брудныя лісткі.

Паказальны загад АО № 10 германскага камандавання, разасланы палявым камендатурам. Загад гаворыць: «Мясцовым камендату-

рам вуліцам, якія названы імем фюрэра або іменамі германскіх ваенных начальнікаў, неадкладна даць нейтральныя вулічныя назвы, з прычыны таго, што надпісы вуліц, названых паказанымі іменамі, як правіла, зрываюцца злонамернымі асобамі з насельніцтва або падвяргаюцца абразлівым прыпіскам».

Ніякія пагрозы, ніякія зверствы фашысцкіх акупантаў не ў сілах пагасіць полымя ўсенароднай барацьбы супроць прыгнятальнікаў. З надыходам вясны, якая зрабіла лягчэйшымі дзеянні партызан, барацьба разгарэлася яшчэ мацней. Павялічваецца лік існуючых партызанскіх атрадаў, узнікаюць усё новыя і новыя атрады. У многіх вёсках, калгасах ствараюцца групы самаабароны, якія перасякаюць шлях нямецкім марадзёрам, грамяць невялікія падраздзяленні ворага, знішчаюць прадстаўнікоў нямецкага камандавання і нямецкіх прыхвасняў.

Па ўсёй Беларусі ідзе ўсямеснае бязлітаснае знішчэнне подлых супольнікаў фашысцкіх катаў. Два мацёрых здраднікі, былы выкладчык нямецкай мовы ў Віцебску Брандт, які стаў бургамістрам горада, і яго жонка былі пакараны партызанамі ў цэнтры горада. Недабіты ў свой час контррэволюцыйны гадзёныш Дадыка, які больш як 20 год быў на ўтрыманні нямецкай разведкі ў Берліне, у першы-ж дзень свайго прыезду валяўся ў пры-

дарожным рове каля Пухавіч, прабіты партызанскімі кулямі.

Змагаючыся плячо ў плячо з Чырвонай Арміяй, народ Беларусі прагоніць ворага з роднай зямлі і сумесна з іншымі савецкімі народамі даб'ецца поўнага разгрому нямецка-фашысцкіх войск. Беларусь была і будзе савецкай!

★

## НЯМА І НЕ БУДЗЕ НЕМЦАМ ЖЫЦЦЯ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

(Прамова на пасяджэнні Вярхоўнага Совета СССР 18 чэрвеня 1942 г.)

Таварышы дэпутаты! Унесены Саюзным Урадам на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР Дагавор паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Злучаным Каралеўствам у Вялікабрытаніі, а таксама прынятае Пагадненне паміж Урадам Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Злучанымі Штатамі Амерыкі маюць велізарнае міжнароднае і гістарычнае значэнне для ўсіх свабодалюбівых народаў, якія ўдзельнічаюць у барацьбе супроць гітлераўскай Германіі.

Тры вялікія дэмакратычныя дзяржавы — Совецкі Саюз, Вялікабрытанія і Злучаныя Штаты Амерыкі аб'едналі свае намаганні ў мэтах поўнага разгрому гітлераўскай Германіі і справядлівага пасляваеннага ўпарадкавання міру.

Дагавор і Пагадненне ўмацоўваюць баявое супрацоўніцтва свабодалюбівых народаў у вайне супроць гітлераўскай Германіі, якая

ўяўляе велізарную пагрозу народам усяго свету.

Дагавор і Пагадненне сустрэлі ўсеагульнае адабрэнне нашага народа, а таксама адабрэнне грамадскай думкі ўсіх свабодалюбівых краін. Гэтыя акты справядліва ацэньваюцца, як важнейшыя падзеі ў жыцці Еўропы з пачатку вайны. Яны азначаюць паўнейшы правал гітлераўскіх планаў раз'еднання сіл дэмакратычных дзяржаў.

Велізарныя ваенна-стратэгічныя рэсурсы ўсіх дэмакратычных дзяржаў цяпер з усёй сілай павінны абрушыцца супроць гітлераўскай Германіі ў імя высокай, пачэснай мэты вызвалення ўсіх народаў, якія стогнуць пад ярмом нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гітлераўскія разбойнікі паднялі акрываўлены нож над усім чалавецтвам, над вялікімі дэмакратыямі свету, над сучаснай культурай і цывілізацыяй. Вар'яты, якія разбэсцілі цэлае пакаленне германскага народа, спадзяваліся разбэсціць усё чалавецтва, ператварыць увесь свет у спапялёныя руіны, каб на гэтых руінах узняць свой выкляты сцяг цемрашалу, чалавеканенавісніцтва, рабства, амярцвення ўсяго квітнеючага і жывога на зямлі. Ап'янелыя ад лёгкай перамогі ў Еўропе, яны думалі заваяваць увесь свет, спадзяючыся ўнесці раскол у адзінства свабодалюбівых народаў.

Нямецка-фашысцкая армія, якая абрушыла на Беларускую Савецкую Рэспубліку ўсю сі-

лу першага ўдара вайны, зграяй шалёных сабак уварвалася на прасторы нашай квітнеючай радзімы, залiваючы крывёю сыноў і дачок беларускага народа нашу зямлю, у попел і прах ператвараючы ўсё, што створана творчай і ўпартай працай беларускага народа за цэлыя дзесяцігоддзі.

Суровыя і цяжкія дні перажывае беларускі народ. Стогны людзей, якіх закатавалі ў Мінску, Магілеве, Полацку, Бабруйску, Шклове і другіх гарадах і сёлах Беларусі, абляцелі ўвесь свет.

Ніколі за ўсю сваю нацыянальную гісторыю беларускі народ не падвяргаўся такой небяспецы. Гутарка ішла і ідзе аб жыцці, або смерці цэлага народа. Жорсткім тэрорам, бессэнсоўнымі забойствамі гітлераўцы разлічвалі запалохаць беларускі народ, зламаць яго волю да супраціўлення, ператварыць у бязмоўных рабоў нямецкіх захопнікаў.

Але гітлераўцам не ўдалося і не ўдасца ніколі зламаць волю беларускага народа. Мужны беларускі народ падняўся на вялікую вызваленчую барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за сваю векавую культуру, за сваю родную зямлю, за свой нацыянальны гонар і незалежнасць.

Многа сотняў тысяч беларусаў самаадданa змагаюцца ў радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, плячом да пляча з усімі народамі

Савецкага Саюза супроць агульнага смяртэльнага ворага — гітлераўскіх захопнікаў.

Савецкі Саюз ведае і ўшаноўвае герояў Савецкага Саюза, доблесных сыноў беларускага народа, патрыётаў нашай Радзімы — двойчы Героя Савецкага Саюза Грыцаўца, Герояў Савецкага Саюза генерала Даватара, легендарнага лётчыка капітана Гастэла, снайпера Ф. Смалячкова, лётчыкаў Талаліхіна, Антоненка, Каўшарава, танкіста Палаўчэню, Герояў Савецкага Саюза партызан Бумажкова, Паўлоўскага, Сільніцкага і многіх іншых.

Беларусы разгарнулі з вялізнай сілай партызанскую барацьбу. Тысячы партызанскіх атрадаў грамяць камунікацыі праціўніка, знішчаюць жывую сілу, знішчаюць тэхніку, базы і штабы ворага.

У Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі даведаліся, што такое народная помста. Яны зразумелі, з якім незвычайным праціўнікам яны маюць справу. Гэтая барацьба ўсё мацней распальваецца з кожным днём. Беларусы пакляліся не скласці зброі да таго часу, пакуль апошні нямецкі салдат не знікне з нашай савецкай зямлі, і мужны беларускі народ гэтае сваё слова стрымае.

З высокай трыбуны Вярхоўнага Савета, ад імя беларускага народа заяўляю, што міжнародныя акты Савецкага Урада, Дагавор з Вялікабрытаніяй і Пагадненне са Злучанымі

Штатамі Амерыкі сустрэты нашым народам з вялікім задавальненнем і цалкам адабраюцца.

Адзінства поглядаў свабодалюбівых краін па пытаннях вядзення вайны, ясная перспектыва цеснага супрацоўніцтва народаў пасля пераможнай вайны, усё, што ўвасоблена ў гэтым баявым саюзе вялікіх народаў, усяляе ў нас новыя сілы і ўпэўненасць у поўным разгроме ворага.

Няхай жыве пабеданосны саюз вялікіх дэмакратый свету!

Няхай жыве арганізатар і правадыр пабеданоснай барацьбы народаў Совецкага Саюза— наш таварыш **Сталін! (Бурныя апладысменты.)**

★

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА У БЕЛАРУСІ

Нямецка-фашысцкія захопнікі абрушылі на Беларусь, як і на Украіну, усю сілу першых udaraў. Праз Беларусь ляжаў шлях на Усход, на Маскву. Узброены да зубоў танкамі, авіяцыяй, вораг нечакана і вераломна ўварваўся ў нашу краіну. Скарыстаўшы перавагі, якія дае нечаканасць нападу, гітлераўцы цяснілі Чырвоную Армію і займалі совецкую тэрыторыю.

Над радзімай навісла найвялікшая небяспека. Паўстала пытанне аб жыцці і смерці совецкай дзяржавы, аб тым — быць народам Совецкага Саюза свабоднымі ці падпасці пад рабства.

Беларускі народ аказаў мужнае, гераічнае супраціўленне гітлераўскім полчышчам. Неўміручай славай пакрылі сябе пагранічныя войскі. Яны першыя ўступілі ў бой з ворагам, які перавышаў іх па колькасці ў многа разоў. Жменькі герояў перагараджвалі шлях цэлым палкам і дывізіям праціўніка, затрымліваючы

іх, пакуль у бой уступалі сілы Чырвонай Арміі.

Тысячы варожых парашутыстаў, кінутых у наш тыл, былі знішчаны байцамі, знішчальнымі батальёнамі і працоўнымі гарадоў і вёсак.

Мільёны жыхароў Беларусі ад малога да старога вышлі рабіць абарончыя збудаванні.

Шматдзённыя крывапралітныя баі ішлі за гарады і водныя рубяжы Беларусі. Да 9 ліпеня біліся доблесныя байцы і камандзіры Брэсцкай крэпасці, нягледзячы на тое, што праціўнік прарваўся далёка наперад і яны аказаліся ў тыле. Ні бесперапынныя бамбёжкі, ні ўраганны артылерыйскі агонь не змаглі зламаць баявы дух акружаных абаронцаў крэпасці — гарнізон рашыў лепш са славай загінуць у баю, чым здацца ў ганебны палон.

Славай пакрыла свае сцягі 100-я ордэна Леніна і ордэна Чырвонага Сцягу дывізія пад камандаваннем палкоўніка Русіянава, якая абараняла Мінск. Дывізія на працягу некалькіх дзён вытрымлівала націск нямецкай танкавай арміі Гудэрыяна. У жорсткіх баях падраздзяленні дывізіі знішчылі 400 варожых танкаў. Пазней дывізія была ператворана ў гвардзейскую. Камандуе ёю ўсё той-жа баявы камандзір, зараз ужо генерал-маёр Русіянаў.

Ля Гомеля ляглі касцьмі звыш 70 тысяч варожых салдат і афіцэраў. Сумесна з часцямі Чырвонай Арміі горад абаранялі і падраздзяленні народнага апалчэння. Шэсць сутак,

дні і ночы, бесперапынна біўся гомельскі полк народнага апалчэння, адбіваючы ярасныя атакі. Апалчэнцы самаадданна і мужна абаранялі родны горад і наносілі немцам вялікія страты.

У самы разгар баёў на тэрыторыі Беларусі паўсюды пачалася эвакуацыя прамысловасці. Сотні фабрык і заводаў рэспублікі з усім абсталяваннем і рабочымі калектывамі былі поўнасцю эвакуіраваны ў глыбіню краіны.

Па ўсёй Беларусі палалі пажары. Калгаснікі палілі хлеб і тэхнічныя культуры, каб яны не дасталіся ворагу. Усе пасевы ільну і канаплі былі знішчаны на корані. Калгаснікі забяспечылі сябе мінімальным запасам хлеба, а ўсё астатняе амаль цалкам спалілі і знішчылі.

Вядома, цяжка было калгаснікам знішчаць здабыты імі ўпартай і чэснай працай багаты ўраджай, але яны свядома ішлі на ахвяры. Інтарэсы радзімы для іх былі вышэй за ўсё. «Не аддадзім ворагу хлеба, няхай здохне ад голаду, — гаварылі ўсюды калгаснікі. — Будзе савецкая ўлада — будзе і хлеб».

З нечуванай лютасцю і жорсткасцю знішчаюць гітлераўскія каты мірнае насельніцтва. Нямецка-фашысцкія нягоднікі паляць дашчэнту цэлыя гарады і вёскі, расстрэльваюць, душаць, вешаюць, спальваюць мірных жыхароў, топяць іх у рэках, вазёрах, калодзежах і балотах, закопваюць жывымі ў ямы. Фашысты атручваюць дзяцей і жанчын. У Мінску варвары лавілі дзяцей, якія страцілі бацькоў, і

расстрэльвалі. У многіх вёсках калодзежы былі напоўнены трупамі дзяцей. Немцы ўвялі паўсюды сістэмы заложнікаў.

Гітлераўскія забойцы ўчынілі крывавую разню ў Мінску, Віцебску, Пінску, Магілеве, Оршы, Мазыры, Бабруйску, Крупках, Лунінцы, Калінкавічах, Хойніках, Лёзне, Быхаве, Парычах, Новабеліцы і ў многіх іншых гарадах і вёсках Беларусі.

У штабе разгромленай партызанамі кавалерыйскай брыгады «СС» захоплена тэлеграма імперскага фюрэра «СС» і начальніка германскай паліцыі Гімлера. У гэтай тэлеграме кат Гімлер выказвае нездавальненне сваімі галаварэзамі. Ён лічыць, што колькасць знішчаных мірных жыхароў нязначная, і загадвае камандзірам злучэнняў пры правядзенні аперацый дзейнічаць бязлітасна і штодзённа дакладваць яму аб колькасці расстраляных. Крывавы сабака германскага фашызма патрабуе больш крыві народнай.

Партызаны захапілі таксама дакумент камандзіра кавалерыйскага палка гэтай-жа брыгады «СС» аб «уціхамiраннi» Старобінскага раёна Беларусі. Камандзір палка дакладвае, што разам з 239 палоннымі яго падраздзяленнем расстраляны 6.504 мірныя жыхары. Камандзір другога палка гэтай-жа брыгады фон-Магіл у дакладзе апісвае спосабы «уціхамiрання» у адным з раёнаў:

«Мы выгналі жанчын і дзяцей у балоты,

але гэта не дало адпаведнага эфекту, бо балоты аказаліся недастаткова глыбокімі, каб можна было ў іх утапіцца. На глыбіні аднаго метра можна было дасягнуць цвёрдага грунту».

Малюнак «уціхаміравання» дапоўніў адзін з удзельнікаў карнай экспедыцыі, галаварэз Іёганес Гердэр. Вось што ён пісаў сваёй жонцы ў пісьме, якое перахоплена партызанамі:

«Мы кідаем ручныя гранаты ў жылыя дамы. Дамы вельмі хутка гараць. Агонь перакідваецца на другія хаты — прыгожае відовішча. Людзі плачуць, а мы смяёмся над іх слязамі».

Акупанты планамерна знішчаюць гарады і вёскі Беларусі. Спалены і разбураны цэлыя кварталы ў Гродна, Лідзе, Ваўкавыску, Баранавічах, Віцебску, Магілеве, Оршы, Полацку. Поўнасцю спалены і разбураны Гомель, Рагачоў, Шклоў, Тураў, Петрыкаў і іншыя. У Мінску разбурана 85 процантаў дамоў.

Кожны нямецкі салдат можа спаліць вёску, расстраляць яе жыхароў. У вёсцы Стайках, Гарадоцкага раёна, Віцебскай вобласці, нямецкі камендант вывесіў наступную аб'яву:

«Насельніцтву вёскі Стайкі, Аляксандраўскай воласці.

31 кастрычніка 1942 года адным нямецкім салдатам пры ўездзе ў вёску Стайкі, каля маста, згублены нямецкі веласіпед, а таксама інструменты ў скураным чахле.

Насельніцтву вёскі Стайкі загадваецца неадкладна знайсці ўказаныя згубленыя рэчы і

не пазней вечара 1 лістапада 1942 года здаць у палявую жандармерыю ў Гарадку.

Калі рэчы да ўказанага тэрміну не будуць здадзены ў палявую жандармерыю, то як вёска Стайкі, так і навакольныя пасёлкі будуць зраўнаваны з зямлёю».

Гітлераўцы няспынна грабяць і вывозяць у Германію ўсё, што мае якую-небудзь каштоўнасць. Грабяжы ўвайшлі ў сістэму і пастаўлены на шырокую дзяржаўную нагу.

У загадзе камандавання паўночнай армейскай групай за № 1422/41 гаворыцца:

«Усе валеныя боты, якія ёсць у рускага грамадзянскага насельніцтва, уключаючы і дзіцячыя, падлягаюць неадкладнай рэквізіцыі. Карыстацца валенымі ботамі забараняецца. За ўкрыццё валёнак караць таксама, як за захаванне зброі (расстрэл)».

Аграбленне насельніцтва праводзіцца таксама і ў выглядзе ўсялякіх абавязковых паставак шматлікіх непасільных падаткаў і падбораў.

Апрача падаткаў, падушных, падаходных на будынкі, на жывёлу і птушку, на кошак і сабак бяруць яшчэ падаткі за патэфон, за вокны ў доме, якія выходзяць на вуліцу і на двор. Апрача таго бярэцца асобна на ўтрыманне старшыны, на ахову дарог, на ахову мастоў, на ўтрыманне паліцыі, на ўтрыманне нямецкіх атрадаў і каманд, расквартараваных у данай мясцовасці, на ўтрыманне начальніка паліцыі і т. д.

У Віцебскай обласці ўведзены яшчэ падаткі на вазоны, на рыбалоўныя вудачкі.

Кожны камендант уводзіць падаткі, якія яму захочацца, у любых памерах. Пры дапамозе штрафаў, цялесных пакаранняў і расстрэлаў фашысты здзіраюць падаткі.

* * *

Немцы праводзяць палітыку анямечання беларускага народа. Яны пачалі з таго, што забаранілі тэрмін «Беларусь», замянілі яго словам «Беларутэнія», а беларус, такім чынам,— беларуцін. Гітлераўцы хочуць выкараніць слова «рус», якое напамінае аб дружбе і брацтве беларускага і рускага народаў.

Крывавыя нямецкія сабакі разбурылі і апаганілі помнікі, творы нацыянальнай культуры, спустошылі гарады і вёскі, спалілі школы і храмы, жыллё і калгасы. Гітлераўцы хочуць надзець на шыю беларусаў ярмо рабства. Немцы гвалтоўна вывозяць з Беларусі на катаргу ў Германію тысячы мужчын і жанчын. Днём і ноччу людзей хапаюць на вуліцах, у хатах, галодных і раздзетых гоняць пад канвоем у Германію. Там іх трымаюць у канцэнтрацыйных лагерах, мораць голадам і прымушаюць выконваць самыя цяжкія работы.

Масавым тэрорам, зверствамі, забойствамі мірных жыхароў гітлераўцы хацелі запалохаць народ, паставіць яго на калені, зламаць яго

волю да перамогі. Гэта ім не ўдалося і ніколі не ўдасца.

Захапіўшы тэрыторыю Беларусі, немцы не пакарылі беларусаў. Наш народ ненавідзіць акупантаў, і ён са зброяй у руках змагаецца супроць іх. Пад кіраўніцтвам партыі, пад кіраўніцтвам і па ўказаннях вялікага Сталіна ў тыле захопнікаў разгарэлася самая жорсткая і непрымірымая барацьба, якой суджана адыграць велізарную ролю ў разгроме і выгнанні акупантаў.

Па заданню партыі лепшыя людзі, партыйныя і непартыйныя большэвікі, засталіся ў тыле для разгортвання партызанскай вайны. Многія сотні партызанскіх атрадаў дзейнічаюць у Беларусі. Супроць нямецкіх акупантаў змагаюцца калгаснікі, рабочыя і інтэлігенты, беспартыйныя і партыйныя, мужчыны і жанчыны, моладзь і старыя, людзі ўсіх узростаў і прафесій. У рэспубліцы існуе шырокая сетка падпольных партыйных і комсамольскіх арганізацый. У глыбокім тыле праціўніка выдаюцца друказаныя газеты, лістоўкі і нават часопісы.

Партызанская вайна супроць акупантаў ахапіла велізарныя масы насельніцтва. Сіла гэтага руху заключаецца ў яго глыбока народным патрыятычным характары, у імкненні народа скінуць ярмо ненавісных захопнікаў. Народны характар партызанскага руху нараджае разнастайнасць формаў супраціўлення ворагу: адкрытая ўзброеная барацьба партызанскіх атра-

даў, невыкананне распараджэнняў акупацыйных улад, зрыў эканамічных мерапрыемстваў акупантаў, адзіночныя дыверсіі, нанясенне страт ворагу ўсімі магчымымі сродкамі і спосабамі ўсюды, дзе толькі можна.

Таварыш Сяргей, сакратар Гомельскага падпольнага Абкома КП(б) Беларусі, паведамляе:

«Насельніцтва бачыць у партызанах не толькі частку ўзброеных сіл СССР. Насельніцтва разглядае партызан як адзіных прадстаўнікоў совецкай улады на акупіраванай тэрыторыі. Сем'і чырвонаармейцаў знаходзяцца пад абаронай партызан. Дзякуючы партызанам сем'і чырвонаармейцаў атрымліваюць хлеб, бульбу, малако. Партызаны далі рашучы адпор спробам старастаў накіраваць жонак чырвонаармейцаў на работу ў Германію».

Патрыятызм і адданасць народа совецкай уладзе праяўляюцца масава і ў самых разнастайных формах.

Насельніцтва аказвае партызанам усебаковую дапамогу, забяспечвае прадуктамі і зброяй, збірае боепрыпасы, паведамляе каштоўныя звесткі аб праціўніку, папярэджвае аб прасоўванні немцаў, аб паяўленні карных атрадаў, выконвае асобныя даручэнні партызан.

60-гадовы дзед Іван К. адкапаў у лесе 8 спраўных вінтовак і 400 патронаў, раней схаваных ім, прынёс у атрад і, перадаючы іх камандзіру атрада, заявіў: «Я так і ведаў, што яны спатрэбяцца нам».

У адзін з атрадаў прышла бабулька 80 год, у падвянечнай хустцы, якую яна хавала ўсё сваё жыццё, прынесла патроны. Звяртаючыся да камандзіра атрада, яна сказала: «Берагла я гэтыя патроны цэлы год. На, родны, спатрэбяцца яны вам. Біце праклятую немчуру».

Жыхары хутара Н. даставілі партызанам боепрыпасы, зброю, у тым ліку 5 кулямётаў і мінамёт.

Сяляне аднаго раёна адвялі русло ракі. На пытанне — навошта яны гэта зрабілі — патрыёты адказалі: «Калі вада сыйдзе, мы са дна дастанем многа зброі, яна нам патрэбна».

Дзеці не наведваюць фашысцкія школы. У некаторых раёнах Віцебскай вобласці дзяцей прымусова загналі ў школы, прымусілі слухаць вар'яцкія пропаведзі фашысцкіх прыслужнікаў, вывучаць нямецкую мову. У адной вёсцы вучань запытаў настаўніка: «Чаму ў нас у класе няма партрэта таварыша Сталіна?» Другі вучань запытаў: «Ці хутка мы пераможам немцаў?» У другой школе вучань запытаў настаўніка ў часе ўрока: «Калі прыдуць нашы?»

Рабочыя і сяляне зрываюць эканамічныя мерапрыемствы нямецкіх акупацыйных улад. Яны не плацяць падаткаў, ухіляюцца ад паставак, хаваюць ад грабежнікаў усё, што толькі можна. Вось як характарызуе становішча ў вёсцы фашысцкі начальнік Бярэзінскага раёна:

«Палявой камендатуры, аддзяленне № 7 Ваеннае ўпраўленне горада Магілеў.

У сувязі з заражэннем раёна партызанамі, нармальная работа раёна прыпынена і праводзіцца з перабоямі. Так, з 17 валасцей раёна работа праводзіцца толькі ў адной воласці ў цэнтры раёна і то толькі часткова. Шматлікія падаткі ад насельніцтва раёна ў касу ўправы не паступаюць і такім чынам управа раёна не мае ніякіх сродкаў. Зарплата служачым і рабочым за сакавік, красавік і май месяцы гэтага году не выплачана, і да ліквідацыі ў раёне партызанскіх атрадаў збор з насельніцтва падаткаў немагчымы. На аснове вышэйсказанага, прашу прадаставіць нам крэдыт у колькасці 300 тысяч рублёў.

Начальнік Бярэзінскага раёна».

Рабочыя, загнаныя гвалтоўна на некаторыя прадпрыемствы, якія немцам часткова ўдалося аднавіць, робяць дыверсіі, працуюць марудна, зрываюць заказы, ламаюць станкі. У некаторых выпадках рабочыя выводзілі са строю абсталяванне ці падпальвалі прадпрыемствы і потым ішлі да партызан. Так было, напрыклад, у Гайнаўцы, дзе рабочыя спалілі цэхі завода і пайшлі ў партызанскі атрад. У Мінску, на заводзе імені Варашылава, рабочыя спалілі цэх зборкі акумулятараў для танкаў. У Мінску-ж агнём знішчана лямцавая фабрыка, якая выпускала валёнкі для немцаў.

Непрымірымая барацьба беларускага народа выклікае бездапаможную ярасць немцаў. Фа-

шысцкі міністр акупіраваных тэрыторый Розенберг у сваім выступленні сказаў:

«У выніку 23-гадовага панавання большэвікоў насельніцтва Беларусі ў такой ступені заражона большэвіцкім светапоглядам, што для мясцовага самаўпраўлення не знаходзіцца ні арганізацыйных, ні персанальных умоў».

Ён прыходзіць да сумнага для сябе вываду:

«Пазітыўных элементаў, на якія можна было-б абаперціся, у Беларусі не выяўлена».

Гітлераўскі намеснік у Беларусі скардзіцца:

«Беларуская моладзь прасякнута большэвіцкім духам. Гэту моладзь не ўдасца перацягнуць на свой бок».

Партызанскія атрады Беларусі знішчаюць жывую сілу і тэхніку ворага, пускаюць пад адкос паязды, узрываюць масты, знішчаюць сувязь, штабы, склады, базы, знішчаюць здраднікаў.

Спачатку вайны партызанскія атрады знішчылі 121.675 нямецкіх салдат, 3.039 афіцэраў, у тым ліку 13 генералаў, пусцілі пад адкос 1.079 воінскіх эшалонаў, узарвалі 980 чыгуначных і шасейных мастоў, знішчылі 259 танкаў і бронемашын, знішчылі і збілі 205 самалётаў, 5.033 легкавыя і грузавыя машыны, 181 базу і склад, 19 штабаў воінскіх часцей і злучэнняў працiўніка, у тым ліку армейскі штаб, карпусны і некалькі штабаў дывізій.

Партызаны паказваюць здзіўляючыя прыклады гераізму і доблесці, наносяць гітлераў-

цам вялікія страты і трымаюць іх у заўсёдным страху.

Атрад тав. Ф. зрабіў глыбокі рэйд па тылах праціўніка. Партызаны фарсіравалі раку Заходняя Дзвіна і за паўтары месяцы прайшлі 500 кіламетраў. Атрад разграміў штаб нямецкай дывізіі ў мястэчку Бароўка. У гэтай аперацыі быў забіт нямецкі генерал-маёр Якобі.

Атрад імя Гастэла знішчыў поезд з эсэсаўцамі.

Партызанскія атрады «За Савецкую Беларусь» і «Бясстрашны» узарвалі мост праз раку Дрыса на магістралі Полацк—Дзвінск. Даўжыня маста—94 метры. Рух на гэтым участку быў спынен на 16 сутак.

Партызанскі атрад, які дзейнічае ў глыбокім тыле, узарваў мост даўжынёю 135 метраў праз раку Пціч на чыгунцы Гомель—Брэст-Літоўск, сарваў рух паяздоў на 18 сутак. Другі атрад узарваў мост праз раку Друць на чыгунцы Асіпавічы—Магілеў. Даўжыня маста 128 метраў. Рух па чыгунцы быў спынены на 14 сутак.

Група партызан зрабіла налёт на чыгуначную станцыю Слаўнае. Савецкія патрыёты ўзарвалі электрастанцыю, 2 эшалоны з грузамі, 6 казарм, 16 складаў, знішчылі ўсе сродкі ўпраўлення рухам: апаратуру, стрэлкі, семафоры, 2 воданапорныя вежы, 2 вадакачкі, 2 блокпасты і мост праз раку Пліс.

Партызанскі атрад тав. Д. разграміў гарнізон праціўніка ў вёсцы Ляшчове. Пасля да-

кладнай разведкі партызаны раптоўна атакавалі ворага. Аперацыя была праведзена паспяхова. Праціўнік страціў звыш 380 салдат і афіцэраў. Страты партызан: 3 забітых, 4 параненых.

У Бабруйску партызаны забілі нямецкага палкоўніка Шаумбергера і афіцэраў, якія сабраліся да яго ў госці.

Група партызан замініравала ўчастак чыгункі Старое Сяло—Язвіна. Поезд, які ішоў з Полацка ў Віцебск, узляцеў у паветра. Разбіты 2 паравозы, 14 вагонаў. Забіта 250 салдат і афіцэраў, паранена 350.

Партызаны знішчылі рэдактара віцебскай фашысцкай газецінкі «Новый путь» здрадніка Брандта.

Партызанскія атрады смела ўступаюць у барацьбу з вялікімі часцямі праціўніка. Характэрна ў гэтых адносінах аперацыя, праведзеная атрадам «Я».

21 снежня 1942 года тры батальёны праціўніка, узмоцненыя артылерыяй і танкамі, спрабавалі знішчыць партызан, наступаючы на лес з трох бакоў. Партызаны рашылі актыўнымі дзеяннямі невялікіх груп звесці батальёны гітлераўцаў адзін з другім, а асноўнымі сіламі непрыкметна выйсці з лесу і нанесці ўдары карнікам з тылу.

Гэты замысел удаўся. Невялікія групы партызан прыцягнулі ўвагу праціўніка, зацягнулі яго ў глыбіню лесу і раптоўна адышлі. Пача-

лася перастрэлка паміж гітлераўскімі батальёнамі. У гэты час партызаны ўдарылі з тылу. Узнялася паніка. Праціўнік панёс вялікія страты і вымушаны быў адыйсці.

Карныя экспедыцыі бяссільны задушыць партызанскі рух. Партызаны прадаўжаюць бесперапынна наносіць удары па ворагу, застаючыся неўлавімымі.

На ахову камунікацый, на барацьбу з партызанамі акупанты вымушаны адцягваць ад фронта значныя сілы і тэхніку.

Партызанскі рух расце, мацнее і шырыцца. Асабліва ўзмацніўся прыток у партызанскія атрады ў сувязі з перамогамі совецкіх войск у раёне Сталінграда, на Поўдні, на Цэнтральным фронце і на другіх участках совецка-германскага фронта.

Камісар вялікага партызанскага атрада, які дзейнічае ў Вілейскай абласці, таварыш Лука паведамляе:

«Моладзь, дзяўчаты, старыя са слязамі на вачах просяць, каб іх прынялі ў партызаны. Патрэбна зброя. У адным толькі Н-скім раёне хоць сёння можна скарыстаць 1.253 чалавекі. Адсюль самі мяркуйце аб настроі. Пры наступленні Чырвонай Арміі на захад ніводзін фрыц адсюль жывым не выйдзе».

Такіх паведамленняў вельмі многа.

Баявая магутнасць Чырвонай Арміі ў ходзе вайны значна вырасла і прадаўжае расці. Чырвоная Армія поўнасцю ўзяла ініцыятыву

ў свае рукі, наносіць зараз сакрушальныя ўдары па нямецка-фашысцкіх полчышчах. Нямецкі фронт трашчыць.

Гісторыя вучыць нас, што перамога над захопнікамі часта дасягалася не толькі барацьбой адной рэгулярнай арміі, але аднachасова і народным партызанскім рухам, які садзейнічае канчатковаму разгрому захопнікаў.

Напалеону не ўдалося заняволіць нашу краіну ў 1812 годзе, ён быў разгромлены рускай арміяй, якая атрымала падтрымку ўзброенага народа, разгарнуўшага бязлітасную партызанскую барацьбу ў тыле ворага. Напалеонаўская армія, у той час самая магутная ў свеце, лягла касцьмі ў Расіі, таму што побач з рэгулярнай рускай арміяй на абарону айчыны ўзняўся народны партызанскі рух.

Так было ў годы грамадзянскай вайны ў Расіі. Чырвоная Армія разбіла інтэрвентаў і белагвардзейцаў на ўсіх франтах і адстаяла ад смяртэльнай небяспекі тады маладую яшчэ Совецкую рэспубліку, дзякуючы ўзброенай барацьбе ўсяго народа, які арганізаваў партызанскі рух у тыле варожых армій. У айчыннай вайне супроць нямецкіх акупантаў партызанскі рух павінен стаць справай усіх і кожнага. Партызанская барацьба павінна ахапіць яшчэ больш шырокія масы совецкіх людзей, якія апынуліся пад фашысцкім ярмом.

Акупанты расплачваюцца ўжо за ўсе свае злачынствы. Совецкі народ бязлітасна знішчае

нямецкае звяр'ё на франтах айчыннай вайны, знішчае ў тыле ў партызанскай барацьбе.

З вялікім задавальненнем і радасцю беларускі народ сустрэў вестку аб бяспрыкладным у гісторыі паражэнні немцаў пад Сталінградам, якое закончылася знішчэннем і палонам 330 тысяч самых адборных нямецкіх войск. Сярод гэтай арміі разбойнікаў поўнасцю знішчан 8 германскі пяхотны корпус, той корпус, які заліў шлях ад Гродны да Мінска і Гжацка крывёю совецкіх людзей. Такі-ж лёс чакае ўсіх захопнікаў.

Беларускі народ — рабочы клас, сялянства, інтэлігенцыя, беларуская партыйная арганізацыя, — бязмежна адданы совецкай уладзе, партыі Леніна—Сталіна, вялікаму Сталіну, бачыць зараз перад сабою адну задачу — змагацца за вызваленне Совецкай Беларусі. У гэтым сэнс нашага жыцця. Беларусь была і будзе совецкай.

★

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

Партызанскі рух у тыле нямецкіх захопнікаў стаў грознай сілай і ператварыўся ў адну з важнейшых умоў разгрома ненавісных ворагаў.

Таварыш Сталін ва ўсіх сваіх выступленнях і загадах нязменна ацэньваў партызанскі рух як важнейшую ўмову нашай перамогі. Ужо 3 ліпеня 1941 года таварыш Сталін у прамове па радыё, паказваючы на неадкладныя задачы, якія ўзніклі ў сувязі з вайной, сказаў:

«У занятых ворагам раёнах трэба ствараць партызанскія атрады, конныя і пешыя, ствараць дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны ўсюды і скрозь, для ўзрыву мастоў, дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, падпалу лясоў, складаў, абозаў. У захопленых раёнах ствараць невыносныя ўмовы для ворага і ўсіх яго пасобнікаў, праследваць і знішчаць іх на кожным кроку, зрываць усе іх мерапрыемствы».

Кожны сталінскі дакумент перыяду Айчыннай вайны змяшчае ў сабе зварот да партыза-

наў і партызанак, падкрэсліваючы тым самым тую велізарную ролю, якую яны заклікаиы адыгрываць у знішчэнні сіл ворага.

Партызанскі рух па самай сваёй прыродзе з'яўляецца глыбока народным, патрыятычным рухам. Ён нарадзіўся і вырас у глыбі народных мас. Ён выкліканы да жыцця народным імкненнем што-б там не сталася захаваць свабоду і незалежнасць роднай краіны, абараніць свой горад, сяло, дом свой гонар, сям'ю, свае здабыткі. Усё, што ёсць у савецкага чалавека блізкага, дарагога, каштоўнага, любімага, на ўсё гэта квапіцца крывяжэрны, ненаедны вораг. І лепшыя сыны і дочкі савецкага народа, якія аказаліся ў варожым тыле, падняліся на непрымірымую, свяшчэнную вайну з нямецкімі разбойнікамі.

Глыбока народны характар партызанскага руху найбольш ярка выяўляецца ў велізарнай і невычэрпнай рознастайнасці форм і метадаў барацьбы з фашыстамі. Тут варта адзначыць і невыкананне распараджэнняў акупацыйных улад, і зрыў эканамічных мерапрыемстваў захопнікаў, і арганізацыю дыверсій, і нанясенне страт ворагу паўсямесна ўсімі магчымымі сродкамі, і, урэшце, галоўную, мацнейшую форму партызанскага руху — узброеную барацьбу партызанскіх атрадаў.

Партызанаў падтрымлівае ўсё савецкае насельніцтва, якое засталося ў тыле ворага. У сапраўды народным характары партызан-

скага руху—галоўная крыніца яго сілы і магутнасці. Сакратар Н-скага падпольнага камітэта КП(б) Беларусі тав. Сяргей паведамляе:

«Насельніцтва бачыць у партызанах не толькі ўзброеную сілу совецкай улады, але і адзіных прадстаўнікоў Совецкай дзяржавы на акупіраванай тэрыторыі. Сем'і чырвонаармейцаў знаходзяцца пад апекай партызан. Наперакор указанням фашысцкіх улад сем'і чырвонаармейцаў, дзякуючы партызанам, маюць хлеб, малако, бульбу. Спробам старастаў накіраваць жонак чырвонаармейцаў на работу ў Германію партызаны далі рашучы адпор. Часта жонкі і наогул сем'і чырвонаармейцаў звяртаюцца за дапамогай да партызан і гавораць ім: — Калі вы пойдзеце адсюль, мы прапалі. Хай аб гэтым ведаюць усе камандзіры і байцы Чырвонай Арміі».

Для мясцовага насельніцтва няма больш важных клопатаў, як аказаць усямерную дапамогу партызанам, падтрымаць іх ва ўзброенай барацьбе з захопнікамі.

У адной з вёсак Сіроцінскага раёна шасцідзесяцігадовы калгаснік К. пасля баёў падабраў на полі 8 вінтовак, 400 патронаў і закапаў іх у надзейным месцы. Пры першай магчымасці ён дастаў гэтую зброю і боепрыпасы, прынёс іх у партызанскі атрад і здаў камандзіру, заявіўшы:

— Я чакаў гэтага часу, калі яны вам спатрэбяцца, каб біць немца...

Сяляне аднаго раёна патрацілі шмат часу і працы, каб адвесці русло мясцовай рэчкі. Навошта спатрэбілася ім гэта складаная работа, якая не выклікалася ніякімі гаспадарчымі патрэбамі?

— Вось няхай толькі вада сыйдзе і дно пакажацца!—растлумачылі патрыёты сваё «меліярацыйнае» прадпрыемства. —Мы ведаем, што там шмат зброі. Будзе з чым партызаніць!..

Паўсямесна насельніцтва акупіраваных савецкіх раёнаў забяспечвае партызан усім, чым можа: хлебам, мясам, малаком, адзеннем. Вельмі часта савецкія грамадзяне, нават абрабаваныя фашысцкімі марадзёрамі, дзеляцца з партызанамі літаральна апошнім кавалкам. І партызаны стараюцца не застацца ў даўгу. Захопліваючы нямецкія склады і абозы, яны раздаюць іх насельніцтву, аказваючы савецкім грамадзянам дапамогу з сваіх трафейных фондаў.

Непарушная брацкая сувязь насельніцтва з партызанамі выражаецца ў той жалезнай стойкасці, з якой савецкія людзі захоўваюць у тайне імёны і месцазнаходжанне партызан, нягледзячы ні на якія пагрозы і рэпрэсіі гітлераўскіх катаў.

У адной вёсцы на Палтаўшчыне немцы некалькі разоў збіралі жыхароў, патрабуючы ад іх назваць прозвішчы сялян, якія пайшлі ў партызаны. У супрацiўным выпадку фашысты пагражалі спаліць вёску датла, расстраляць

усё насельніцтва. Але нічога ў карнікаў не выйшла: сярод совецкіх грамадзян не знайшлося здрадніка.

Імкнучыся на чым-бы там ні стала зламаць супраціўленне совецкага насельніцтва, падсекчы партызанскі рух, немцы пускаюцца на ўсялякія хітрыкі і правакацыі, спрабуючы разам з гэтым затапіць у крыві партызанскі рух.

Гітлераўцы сур'ёзна думалі, што сваімі неапісальнымі зверствамі і бясчынствамі ім удасца запалохаць совецкі народ, зламаць яго маральны дух, задушыць волю да супраціўлення,ператварыць совецкіх грамадзян у бясслоўных рабоў. У штабе разгромленай кавалерыйскай брыгады «СС» знойдзена тэлеграма № 37, якой абвяшчалася, што імперскі фюрэр «СС» і паліцыі Гімлер «лічыць колькасць знішчаных мірных жыхароў вельмі нязначнай і ўказвае, што неабходна дзейнічаць радыкальна, што камандзіры злучэнняў занадта мяккія ў правядзенні аперацый, і загадвае штодзённа дакладваць аб колькасці расстраляных».

Агідныя каты з асаблівай лютасцю выконвалі гэта прадпісанне сваіх главароў—людаедаў. Але вынікі атрымаліся адваротныя тым, якіх чакалі крывяжэрныя фашысцкія заправілы. Не страх і паныласць, не баязлівасць і пакору выклікалі зверствы фашыстаў у совецкім народзе, а прагу бязлітаснай помсты. Слаўная партызанская армія расце і мацнее іменна як армія народных мсціўцаў. Пякучая

нянавісць да ворага, бязмежная любоў да Радзімы прымушае ўсё новыя народныя масы ў тыле ворага брацца за зброю.

Перамагаючы цяжкасці, няўхільна ішоў рост партызанскіх атрадаў, палепшалася іх арганізацыя, тактыка. Усё грозней і грозней становяцца партызаны для ворага. Летам 1942 года, пасля цяжкай зімы, партызанскія атрады, якія ўзраслі колькасна ў некалькі разоў, узмацніліся ў барацьбе, наносілі сакрушальныя ўдары па акупантах у тыле.

Зіма 1942—43 года адзначылася новым няспынным ростам партызанскіх радоў. Насельніцтва акупіраваных тэрыторый, натхнёнае поспехамі наступальных баёў Чырвонай Арміі, вялікімі масамі ішло ў атрады, каб узброенай рукой падтрымаць зімняе наступленне часцей Чырвонай Арміі. Партызанскія атрады ў гэтую зіму наносілі жорсткія і няспынныя ўдары па акупантах. Маецца поўная падстава разлічваць, што ўвесну і летам рост партызанскіх атрадаў пойдзе яшчэ больш высокімі тэмпамі. Партызанская барацьба ў тыле варожых войск набудзе нябачны яшчэ размах, стане **сапраўдным усенародным рухам.**

Усе спробы ворага знішчыць партызанскі рух асуджаны направал, бо немагчыма знішчыць бяссмертны совецкі народ. **Партызанскі рух будзе жыць, мацнець, развівацца аж да таго часу, пакуль ні аднаго фашысцкага захопніка не застанецца на совецкай зямлі.**

Разам з Чырвонай Арміяй, якая ў ходзе вайны набыла багаты вопыт, навучылася біць ворага напэўна, разам з ёй і партызанская армія ў варожым тыле ўдасканальвала сваю баявую дзейнасць.

Тактыка партызанскіх атрадаў надзвычай разнастайна. Партызаны дзейнічаюць пераважна кароткімі, неспадзяванымі, дзёрзкімі і сакрушальнымі ўдарамі, хутка і часта мяняюць участкі сваёй баявой дзейнасці. Яны наладжваюць чыгуначныя катастрофы, узрываюць масты, знішчаюць рухомы састаў, станцыйныя збудаванні і тым самым зрываюць перавозкі жывой сілы і тэхнікі ворага, сур'ёзна дэзарганізуюць яго тыл. Яны нападаюць з засад на асобныя атрады праціўніка, на яго транспарты, робяць налёты на штабы і ўстановы, на склады, базы, аэрадромы, майстэрні, вядуць суд і расправу над здраднікамі і прадажнікамі і г. д. і т. п.

Побач з вялізнай колькасцю малых і сярэдніх партызанскіх атрадаў і груп ёсць значная колькасць партызанскіх атрадаў, якія ў сілу свайго ліку, арганізацыі і ўзбраення могуць ажыццяўляць **буйныя ваенныя аперацыі па ўсіх правілах сучаснага ваенна-тактычнага** мастацтва. У радзе выпадкаў партызаны ўступаюць у працяглыя і напружаныя бai з нямецкімі войскамі, знішчаюць цэлыя гарнізоны праціўніка.

Увосень мінулага года некалькі партызан-

скіх атрадаў з боем авалодалі чыгуначным мастом праз раку Дрыса і ўзарвалі яго. Яны поўнасцю разграмілі нямецкі гарнізон, знішчыўшы каля 600 гітлераўцаў. Рух па магістралі быў спынены на працяглы час.

Бліскучую аперацыю правялі партызаны Смаленскай вобласці ўначы на 5 лістапада 1942 года. Некалькі атрадаў, аб'яднаўшыся, напалі на станцыю Прыгор'е, на ўчастку Смаленск — Бранск. Станцыю ахоўваў нямецкі стралковы батальён, які быў поўнасцю знішчаны. Немцы пакінулі каля 600 трупаў салдат і афіцэраў, а партызаны страцілі 15 чалавек забітымі і 25 параненымі. Скончыўшы бой, партызаны разбурылі ўсе службовыя будынкі, спалілі некалькі складаў, 2 эшалоны, у якіх знаходзілася 17 новых нямецкіх самалётаў, 2 цыстэрны з гаручым, бронедрэзіну, узарвалі 2 чыгуначныя масты, захапілі багатыя трафеі.

Адзін з партызанскіх атрадаў Беларусі заняў раённы цэнтр Расоны, знішчыў гарнізон і пераправіў праз лінію фронта 1.650 савецкіх патрыётаў, якія ўступілі ў Чырвоную Армію.

У баявой гісторыі партызан значыцца некалькі паспяховых рэйдаў па варожым тыле.

Рэйд партызанскага атрада тав. Флегонтава пачаўся ў канцы жніўня мінулага года і працягваўся да 9 кастрычніка. За гэты час партызаны прайшлі з баямі каля 500 км па тылах гітлераўцаў. 12 верасня яны разграмілі штаб нямецкай дывізіі ў м. Бароўка. Усяго за

час рэйду было праведзена 4 буйных аперацыі. Такія-ж паспяховыя рэйды правялі атрад імя Гастэла, партызанская брыгада «За Савецкую Беларусь», атрад «Бясстрашны». Выдатныя рэйды правялі партызанскія атрады тав. К. і С.

На баявым рахунку савецкіх партызан налічваецца каля трох дзесяткаў знішчаных гітлераўскіх генералаў. Нямецкі генерал-маёр Рычард Віртч з Кенігсберга ехаў на легкавой машыне ў штаб 1-га корпуса на нараду. Аўтамабіль разам з генералам быў знішчаны ленінградскімі партызанамі Гладковым, Голікавым і Пятровым. Беларускі атрад Флегонтава ў час свайго рэйда знішчыў пры разгроме штаба нямецкай дывізіі генерал-маёра Якобі. Украінскія партызаны знішчылі ў г. Харкаве камандзіра дывізіі генерала Брауна. Смаленскія партызаны знішчылі генерала Отто фон-Добшыца. Ад рукі народных мсціўцаў загінулі тысячы нямецкіх афіцэраў, у тым ліку нямала палкоўнікаў. У гэтым спісу значацца такія мацёрыя фашысцкія псы, як палкоўнік Пітроф, палкоўнік Шаумбергер і інш. Партызанамі злоўлены і расстраляны буйны нямецкі разведчык фон-Файт.

Вядомае ўяўленне аб дзейнасці слаўных народных мсціўцаў можа даць **зводка паведамленняў з партызанскіх атрадаў за адзін звычайны, радавы дзень**. Вось гэта зводка.

Уначы група партызанскага атрада «За ра-

дзіму» пад кіраўніцтвам тав. Г. і К. узарвала чыгуначны мост праз раку Іватка на ўчастку Канатоп—Зярнова. Мост поўнасцю разбуран.

У 22.00 на ўчастку чыгункі Невель — Віцебск пушчан пад адкос воінскі эшалон праціўніка з жывой сілай і тэхнікай. Знішчана 17 платформ з гарматамі і боепрыпасамі, 24 крытых вагоны, забіта і паранена каля 900 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Партызанскія атрады Б. напалі на гарнізон чыгуначнага маста праз раку Вопь у г. Ярцава, на магістралі Масква—Смаленск. Гарнізон знішчаны. Васьмідзесяціпяціметровы двухпралётны мост узарваны. На ўчастку Смаленск—Вязьма пушчан пад адкос эшалон, паравоз узарваны.

Дыверсійная група атрада «Жалязняк» пусціла пад адкос два сустрэчных цягнікі на чыгунцы Бранск—Льгоў. Разбіты паравоз, 23 вагоны, забіта 150 салдат і афіцэраў.

Уначы на ўчастку чыгункі Клачкі—Стоўбцы пушчан пад адкос воінскі эшалон, які быў гружаны артылерыяй, танкамі, аўтамашынамі і боепрыпасамі. Знішчаны паравоз, 44 вагоны і платформа.

Група атрада Г. на ўчастку чыгункі Негарэлае—Коласава пусціла пад адкос воінскі эшалон з тэхнікай і жывой сілай, які ішоў на фронт. Спалены паравоз і 4 вагоны з боепрыпасамі.

Два партызанскія атрады пад камандаван-

нем С. (Украіна) вялі бой у населеных пунктах С. і Л. з карнай нямецкай групай у складзе двух палкоў з артылерыяй, танкамі, бронемашынамі, пры падтрымцы 4 самалётаў. У выніку бою забіта 350 гітлераўцаў, шмат паранена. Знішчаны сярэдні танк, бронемашына, гармата; адзін самалёт-карэктыроўшчык збіт, другі падбіт.

Падрыўная група тав. Г. (Беларусь) на чыгунцы Віцебск—Полацк у раёне вёскі К. пусціла пад адкос эшалон з аўтамашынамі і гарматамі. Забіта 75 гітлераўцаў, паранена 50. Пашкоджан паравоз і 10 вагонаў.

Падрыўная група з атрада В. у раёне Сувалкі—Сосніцы пусціла пад адкос эшалон з 45 вагонаў, з іх знішчана 19 вагонаў з харчаваннем і боепрыпасамі, 8 платформ з гарматамі і боепрыпасамі.

У раёне Д. у выніку дыверсіі пацярпеў крушэнне нямецкі эшалон з 35 вагонаў. Пашкоджана 11 вагонаў з жывой сілай, 15 платформ з танкамі і бронемашынамі. Знішчана 2 паравозы.

Дыверсійная група імя Шчорса на перагоне Палужжа—Выгонічы пусціла пад адкос эшалон праціўніка з жывой сілай. Разбіты паравоз і 13 вагонаў, забіта 200 гітлераўцаў.

Такі адзін звычайны дзень партызанскіх атрадаў. А колькі партызанскіх атрадаў у гэты-ж дзень змагаліся і перамагалі, але з якойнебудзь прычыны не змаглі перадаць данясенне!

Партызаны не даюць жыцця акупантам. Яны выклікаюць у ворага жывёльны страх. Яны няспынна ўзмацняюць сілу сваіх удараў па захопніках, адцягваюць на сябе шмат варожых войск. Акупанты вымушаны, апрача шматлікіх паліцэйскіх і СС-аўскіх батальёнаў і груп спецыяльных войск, адцягваць для барацьбы з партызанамі буйныя вайсковыя сілы. Дастаткова ўказаць на такія факты. Ленінградскія і калінінскія партызаны ўцягнулі ў бой супроць сябе не менш 3—4 рэгулярных дывізій праціўніка. Супроць беларускіх партызан у гэты-ж час дзейнічала некалькі нямецкіх дывізій, у тым ліку 19-я танкавая дывізія. Супроць партызан, якія дзейнічаюць у Смаленскім і Рослаўльскім напрамках, немцы адначасова кінулі да 6 пяхотных і 2 танкавых дывізій. На Украіне для барацьбы з партызанамі, апрача паліцэйскіх батальёнаў, быў прыцягнут мотакорпус «Нацы». Супроць адной з груп арлоўскіх партызан каля паўтары год прыкаваны 102-я, 105-я і 108-я пяхотныя дывізіі ворага; яны не могуць справіцца з партызанамі і ў той-жа час не могуць ад іх адарвацца.

Партызанскі рух высунуў і праславіў імёны дзесяткаў і соцень легендарных народных герояў, подвігі якіх будуць жыць у вяках, натхняць многія пакаленні совецкіх людзей. У гэтай плеядзе—сыны многіх народаў Совецкага Саюза. Рускі, украінскі, беларускі народы

далі партызанскаму руху такіх сваіх бясстрашных багатыроў, як Герой Совецкага Саюза Заслонаў, Каўпак, Казлоў, Сабураў, Бумажкоў, Дука, Рамашын, Бандарэнка, Іжукін, Курыленка, Рабок, Стралец, Баліцкі, Грышын, Ігнатаў Г. П., Ігнатаў Е. П., Наумаў, Ярэмчук, Паўлоўскі, Сільніцкі, Фёдараў і інш. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 7 сакавіка 1943 года ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі 973 партызаны Украіны, Беларусі, Крыма, Ленінградскай, Калінінскай, Смаленскай і Орлоўскай абласцей. Шмат імён праславілася ў партызанскай барацьбе. Яшчэ шмат іх пакуль што захоўваюць у тайне горы, лясы і стэпы нашай краіны. Патрэбен час, каб ва ўсёй паўнаце раскрыўся перад намі велічны, хвалюючы малюнак народнай барацьбы за гонар і незалежнасць нашай Радзімы.

Герой Совецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі са сваім кулямётам удзельнічаў у баю ў раёне вёсак Платы, Курына і пасёлка Ноўка. Гітлераўцы ў колькасці 350 чалавек з гарматай і мінамётамі абрушыліся на жменьку партызан, якія знаходзіліся ў засадзе. Сільніцкі агнём свайго кулямёта знішчыў 50 немцаў. У яго выйшлі ўсе патроны, ён быў паранены ў абедзве нагі, але працягваў адбівацца ад фашыстаў. Немцы акружылі Сільніцкага. Сабраўшы апошнія сілы, ён прыўзняўся і паспеў нажом параніць аднаго і закалоць двух немцаў. Герой паў у няроўнай схватцы. Яго прадсмярот-

ныя словы: «Вы можаце мяне забіць, але перамагчы... ніколі. Гады вы!»

Партызанка-разведчыца Ніна Кароўка, выконваючы баявое заданне, трапіла ў лапы фашыстаў. Немцы падверглі яе жорсткім катаванням, дабіваючыся звестак аб партызанах. Ніна непахісна перанесла ўсе мучэнні, не вымавіўшы ні слова. Толькі перад смерцю яна кінула катам у твар гордыя словы: «Я сёння памру за Радзіму, але заўтра вы ўсе будзеце знішчаны». Гэта былі прарочыя словы. У наступныя дні калінінскія партызаны з лішкам адплацілі подламу ворагу за пагібель Ніны Кароўка.

На Смаленшчыне партызаны склалі і распяваюць баявую песню аб сваім героі-камандзіры тав. Г. Пад яго кіраўніцтвам змагаецца шмат партызан. Тав. Г. правёў каля 50 баёў і 30 дыверсій на камунікацыях праціўніка. Атрад знішчыў больш 2.000 гітлераўцаў, пусціў пад адкос 12 эшалонаў, узарваў тры вялікіх чыгуначных масты, спаліў тры буйных базы, вызваліў з фашысцкага палону да 8.000 байцоў Чырвонай Арміі.

Аднойчы на партызан тав. Г. абрушыўся нямецкі карны атрад з артылерыяй і мінамётамі. На левым флангзе стварылася крытычная абстаноўка. Тав. Г. зараз-жа кінуўся туды, лёг за кулямёт і трапным агнём скасіў 150 немцаў; астатнія гітлераўцы ў паніцы ўцяклі. Гэты подвіг тав. Г. паўтарыў у баю

пад вёскай Усоўшчынай, дзе на жменьку партызан напала каля 300 немцаў. Герой-камандзір зноў узяўся за кулямёт, падпусціў фашыстаў на 100 крокаў і адкрыў агонь. Немцы, пакінуўшы 70 трупаў, пабеглі.

Праслаўленыя героі-партызаны ўвасабляюць непахісную мужнасць, рашучасць, волю да перамогі, любоў да Радзімы, нянавісць да ворага—усе тыя якасці і пачуцці, якія ў час грозных выпрабаванняў з такой сілай праявіліся ў савецкім народзе. Іх подвігі клічуць да новых бітваў і перамог. Па іх раўняюцца ўсе савецкія патрыёты, якія вядуць барацьбу ў варожым тыле.

Партызанская барацьба ў Вялікай Айчыннай вайне магла набыць такі размах і даць такія вынікі толькі таму, што актыўнасць і ініцыятыва народных мас **узначалены ленінска-сталінскай партыяй, якая ажыццяўляе цвёрдае і мудрае кіраўніцтва.**

Як правіла, мясцовыя партыйныя арганізацыі на чале з іх кіраўнікамі складалі арганізуючае ядро партызанскага руху ў данай вобласці, раёне, горадзе, сяле. Вакол іх згуртоўваліся савецкія людзі, якія рашылі з дапамогай зброі наблізіць час вызвалення Радзімы ад ненавісных акупантаў.

У асобе комуністаў партызаны маюць кіраўнікоў, якія заваявалі давер'е ў агні баёў сваёй самаадданасцю. Вышэй мы расказвалі аб баявым жыцці і рабоце некалькіх выдатных

людзей партызанскага руху. Такіх тысячы. Увесь сэнс свайго жыцця яны бачаць у служэнні інтарэсам народа, а народ плаціць ім сваёй гарачай любоўю, павагай, гатоўнасцю ісці за імі ў агонь і ў ваду.

Можна было-б назваць сотні партызанскіх атрадаў, дзе ў абстаноўцы жорсткіх бітваў крыніцай б'е партыйнае жыццё, дзе партыйна-масавая, палітыка-выхаваўчая работа з'яўляецца магутнай зброяй павышэння боездольнасці партызанскіх атрадаў, узмацнення магутнасці партызанскай зброі.

**Большэвіцкая партыя—душа і арганізатар партызанскага руху.** У гэтым верны залог таго, што ён з кожным днём будзе расці, шырыцца, мацнець.

Партызаны разам з Чырвонай Арміяй, разам з усім совецкім народам атрымалі **праграму далейшай барацьбы з гітлераўскай нечысцю—загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна № 95.**

У імя вызвалення нашай Радзімы ад ненавіснага ворага, у імя канчатковай перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі таварыш Сталін загадаў:

«Шырэй распаліць полымя партызанскай барацьбы ў тыле ворага, разбураць камунікацыі ворага, узрываць чыгуначныя масты, зрываць перакідку непрыяцельскіх войск, падвоз зброі і боепрыпасаў, узрываць і падпальваць вайсковыя склады, нападаць на непрыяцель-

скія гарнізоны, не даваць адступаючаму ворагу спальваць нашы сёлы і гарады, дапамагаць усімі сіламі, усімі сродкамі наступаючай Чырвонай Арміі».

Так найвялікшы палкаводзец яшчэ раз вызначыў выдатную ролю партызанскага руху ў сваім геніяльным стратэгічным плане канчатковага разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Загад таварыша Сталіна натхняе совецкіх людзей акупіраваных тэрыторый на новыя подвігі ў імя вызвалення Радзімы ад ненавіснага ворага. Партызанскі рух ахоплівае найшырэйшыя масы насельніцтва. Новыя тысячы барацьбітоў узнімаюцца на актыўную ўзброеную барацьбу з акупантамі.

Увесну і летам гэтага года вораг з новай сілай адчуе ўзрастаючую магутнасць совецкага партызанскага руху.

Совецкія партызаны гатовы да любых выпрабаванняў, яны памятаюць, што барацьба з нямецкімі захопнікамі толькі разгортваецца і разгараецца, што для іх выгнання і знішчэння яна патрэбуе часу, ахвяр, напружання ўсіх нашых сіл і мабілізацыі ўсіх нашых магчымасцей.

Совецкія партызаны не пашкадуюць сваіх сіл, каб з чэсцю выканаць загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна.

★

## ЗМЕСТ

Стар

Партызанскі рух у вялікай айчыннай вайне . .
Разгараецца полымя партызанскай вайны у Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . 4
Беларускі народ у барацьбе з нямецкімі акупантамі . . . . . . . . . . . . . . . 5
Партызанскі рух у тыле ў немцаў . . . . . 6
Беларусь змагаецца . . . . . . . . . . . . . 7
Няма і не будзе немцам жыцця на беларускай зямлі . . . . . . . . . . . . 8
Партызанская вайна ў Беларусі . . . . . . . 9
Партызанская вайна ў тыле ворага . . . . . . 11

★

Адказны за выпуск І. Гурскі.

Падпісана да друку 4/X 1943 г.
4 друк. аркуш. Тыраж 40.000 А 2727. Заказ № 1

Друкарня «Известий», Масква

75 кап.